ЖЫВУЦЬ У СЭРЦАХ СТУДАТРАДЫ...



ЧЫРВОНКА



«МОЦНЫЯ ДУМКІ» ТРЭНЕРА ГАНДБОЛЬНАЙ ЗБОРНАЙ 15


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 САКАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 55 (29424)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:**

*«Нацыянальная культура — адзін з тых краевугольных камянёў, на якіх узведзены будынак беларускай дзяржаўнасці. Як адзначыў у адным са сваіх выступленняў кіраўнік дзяржавы, без апоры на высокую культуру мы не зможам выхаваць грамадзяніна-патрыёта, руплівага працаўніка, клапатлівага сем'яніна, асобу творчую і духоўна багатую. Зберажэнне і папулярызацыя нацыянальнай культурнай спадчыны, стварэнне твораў мастацтва, якія ўмацоўваюць у людзях гонар за Беларусь, захаванне гістарычнай праўды сродкамі музейнай і бібліятэчнай дзейнасці, выхаванне таленавітай моладзі ў духу патрыятызму сталі прыярытэтамі культурнай палітыкі Беларусі».*

# Вятрак яго мары



**На фотаздымку Яўген САДОЎСКІ са сваімі сынамі Арцёмам і Максімам і незавершаным макетам.**

Жыхар вёскі Салтаны Яўген САДОЎСКІ замахнуўся на вырашэнне цікавай, але няпростай задачы — рэканструяваць драўляны трынаццаціметровы вятрак, які стаіць на ўзгорку акурат за вясковым агародам і з кожным годам усё больш і больш прыходзіць у занядбанне.

Ветравая машына была прывезена сюды пасля вайны з суседняга — Валожынскага — раёна, і, калі верыць старэйшым вяскоўцам, ёй не менш як сто пяцьдзясят гадоў. Але спачатку 37-гадовы энтузіяст плануе завяршыць макет млына — падобную як знешне, так і знутры, толькі паменшаную ў дзесяць разоў, рухомую і дзеючую копію. З ранку да вечара малады мужчына ўвіхаецца на сваёй падсобнай гаспадарцы, трымае шэсць кароў, іншую жыўнасць, а ў вольны час, якога, як заўсёды, няшмат, займаецца замерамі механізма, чарцяжамі і выпілоўваннем мініяцюрных дэталяў для макета.

— Мой дзед Андрэй Аляксандравіч Радкоўскі — здольны і працавіты сталяр і цясляр, быў апошнім млынаром на гэтым млыне. Мне было сем гадоў, і дзед дазваляў быць побач, глядзець, як мелецца збожжа. Памятаю, механізм ужо прыводзіўся ў рух электрычнасцю, я не бачыў, каб млынавыя крылы-лопасці калі-небудзь круціліся, — згадвае Яўген. — Тут малолі зерне і для калгасных ферм, і для насельніцтва. У канцы дзевяностых стары млын «адправілі на пенсію», і ён застаўся без догляду. Так хочацца ўзвезці помнік сялянскай працы, вярнуць яму не толькі прыстойны выгляд, але і належную славу, якую ён заслужыў. А як будзе выглядаць наш пагоркавы ландшафт з ветраком — неверагодна! Калісьці ў нашай акрузе пад дзясятак ветракоў працавала...

Мары, жаданні і прапановы жыхара Салтаноў наконт ветрака былі ўхвалены ў мясцовай гаспадарцы «Гарадзілава» — там паабяцалі дапамагчы з будматэрыяламі. А гэта дае надзею і ўпэўненасць апантанаму руплііўцу.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*Маладзечанскі раён.*

## КОРАТКА

- **Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў лютым 2021 года склала Br1277,1.**
- Уручэнне атэстатаў у школах Беларусі, як плануецца, адбудзецца 10 чэрвеня, ЦТ пачнецца з 16 чэрвеня.



- **Сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Афінах-2004 Віктар Зуеў уключаны ў камітэт ветэранаў і чэмпіёнаў Міжнароднай асацыяцыі бокса.**
- Уезду ў ЕС на беларуска-літоўскай мяжы чакае больш за 1,5 тыс. грузавікоў.

Камунальныя стасункі

## НЯМА СМАЧНЕЙШАЙ ВАДЗІЦЫ, ЯК З РОДНАЙ КРЫНІЦЫ

**Інвентарызацыя азёр, станцыі абезжалезвання і надзейнасць каналізацыі**

**Ваду з 40 % беларускіх крыніц можна выкарыстоўваць для пітнога водазабеспячэння, 94,7 % беларусаў маюць якасную пітную ваду, а аб'ём недастаткова ачышчаных сцёкавых вод памяншаецца. Пра гэтыя і іншыя акалічнасці стану вады і перспектыў яе захавання расказалі эксперты.**

### Магутнасці паверхневай вады

Летась у Беларусі правялі інвентарызацыю паверхневых водных аб'ектаў, каб абагульніць звесткі пра іх. Найперш даследаваліся буйныя: азёры, вадацёкі, вадасховішчы, сажалкі і ўпершыню — крыніцы.

СТАР. 3

Вялікі перапынак

## УВАГА: ВАС ЗДЫМАЕ ШКОЛЬНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ!

Як настаўнікі і вучні клічаўскай школы № 2 імя Ф. Кавалёва ўкараняюць у сваіх сценах інавацыйны праект

**Пры жаданні нават такая не вельмі вялікая навучальная ўстанова ў глыбінцы можа ператварыцца ў сапраўдны Галівуд. Рэпарцёры, артысты, сцэнарысты — гэта ўсё не праблема, калі ёсць жаданне праявіць крэатыўнасць. А які школьнік у душы не марыць трапіць у кадр, або, у крайнім выпадку, зрабіць яго? Настаўнікі клічаўскай школы № 2 вырашылі не перашкаджаць рэалізацыі мар сваіх выхаванцаў, яны толькі каардынуюць працэс і, як той казаў, ствараюць творчую прастору.**

СТАР. 4



Творчы працэс над яшчэ адным сюжэтам для TV.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# КАБ ДАМЫ НЕ ПУСТАВАЛІ

**Прэзідэнт падпісаў Указ № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з дамамі, якія пустуюць», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Дакументам спрашчаецца парадак адчужэння грамадзянамі жылых дамоў, што належаць ім, у сельскіх населеных пунктах і гарадах раённага падпарадкавання, што былі пабудаваныя да 8 мая 2003 года (даты ўступлення ў сілу Закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй»). Адчужацца такія дамы могуць без наяўнасці дакументаў, што сведчаць права на іх, пры ўмове ўнясення звестак аб жылых дамах у пагаспадарчую кнігу сельскага (пасялковага) выканаўчага камітэта або іх узвядзення на зямельных участках, выдзеленых у адпаведнасці з заканадаўствам (незалежна ад дзяржаўнай рэгістрацыі правоў на гэтыя ўчасткі).

Рэгістраваць дагаворы адчужэння будуць выканкамы па месцы знаходжання жылых дамоў без збору платы, а афармляць дакументы на іх і зямельныя ўчасткі павінны будуць пакупнікі.

Указам таксама забяспечваецца стварэнне ўмоў для ўключэння ў абарот жылых дамоў, якія пустуюць тры гады і больш або якія знаходзяцца ў аварыйным стане, а таксама займаемых імі зямельных участкаў. Прадугледжаны адпаведны алгарытм работы выканкамаў па выяўленні такіх дамоў і ўключэнні іх у Адзіны рэестр дамоў, якія пустуюць. Доступ да гэтай базы даных будзе давацца зацікаўленым на бязвыплатнай аснове.

Жылыя дамы, што пустуюць, прызнаныя судом безгаспадарнымі і перададзеныя ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, змогуць прадавацца выканкамамі на аўкцыёнах па рыначнай вартасці з магчымасцю паэтапнага зніжэння цаны да адной базавай велічыні. Аблвыканкамы надзяляюцца правам вызначаць населеныя пункты, на тэрыторыі якіх пустуючыя дамы могуць быць прададзены адразу за адну базавую велічыню. Пакупніку такога дома па яго заяве даецца растэрміноўка аплаты на тэрмін да трох гадоў без індэксацыі плацяжоў.

Знос непрыдатных для выкарыстання пустуючых дамоў, не вышэйшых за два паверхі, дапускаецца без распрацоўкі адпаведнай праектнай дакументацыі.

# ЗА СЛУЖБУ!

## Работнікам МУС уручылі пагоны палкоўніка і дзяржаўныя ўзнагароды ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**У мемарыяльнай зале «Перамога» Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшло ўрачыстае ўручэнне дзяржаўных і ведамасных узнагарод, пагонаў палкоўніка супрацоўнікам органаў унутраных спраў і ваеннаслужачым унутраных войскаў МУС, паведамляе БелТА.**


Фота БелТА.

За значны ўклад ва ўмацаванне законнасці і правапарадку, дзейнасці па забеспячэнні правоў і свабод грамадзян каля 50 супрацоўнікаў органаў унутраных спраў атрымала дзяржаўныя і ведамасныя ўзнагароды. На мерапрыемстве пагоны палкоўніка ўручаны каля 20 прадстаўнікам прафесіі ў сувязі з прысваеннем ім чарговага спецыяльнага звання «палкоўнік міліцыі».

«Вельмі сімвалічна, што ўзнагароджанне і ўручэнне званняў праходзяць у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — гэта наша гісторыя, карані і добрыя традыцыі. Сёння мы ўшаноўвалі афіцэраў органаў унутраных спраў за іх адданасць Радзіме, вернасць народу, за тое, што яны супрацьстаяць злачыннасці і такой няпростай працай робяць усё для забеспячэння міру і спакою ў Беларусі. У складаны для краіны час яны праявілі сябе сумленнымі і прыстойнымі прафесіяналамі сваёй справы», — адзначыла **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА.**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** ад дэпутацкага корпуса павіншаваў прадстаўнікоў прафесіі, падкрэсліў значнасць і складанасць іх дзейнасці. «Не кожнаму гэта пад сілу. Я перакананы, што сучасная Беларусь і яе жыхары ганарацца імі. Гэта паказалі падзеі, якія адбыліся ў жніўні мінулага года і пасля яго. Дзякуючы людзям у пагонах, іх суладным і рашучым дзеянням наш агульны дом не ўдалося раскалоць, раскрасці, пагрузіць у хаос. Вялікі дзякуй за гэта, за праяўленыя мужнасць, стойкасць і вернасць прысязе».

**Міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** адзначыў: «Мінулы год стаў пэўным экзаменам для ўсіх, але ў першую чаргу для вашых падначаленых. Хачу выказаць словы вялікай удзячнасці за выхаванне асабовага складу, за тое, што ніводны супрацоўнік органаў унутраных спраў не завагаўся і выканаў пастаўленыя задачы».

**Ігар СЕРГЕЕНКА:**

# «Важна захаваць дасягненні суверэннай Беларусі»

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта наведаў Асіповіцкі раён

**Ігар Сергеенка сустрэўся з працоўнымі калектывамі раёна і правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях.**


Фота БелТА.

— Для нас важна захаваць дасягненні суверэннай Беларусі і гістарычную памяць народа пра подзвігі нашых продкаў у часы Вялікай Айчыннай вайны, — падкрэсліў ён падчас выступлення перад асіпаўчанамі. — Зараз ідзе працэс дыскрэдытацыі існуючай улады, спроба выставіць героямі тых, хто імкнецца дэстабілізаваць абстаноўку, і тут важна не паддавацца на правакацыі, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Як адзначыў Ігар Сергеенка, сустрэча атрымалася цікавай і насычанай — абмяркоўваўся шырокі спектр пытанняў: пачынаючы з эпідэміялагічнай сітуацыі і палітычнай абстаноўкі ў краіне і за яе межамі і заканчваючы станам эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны і дасягненнямі за гады яе існавання.

Пасля адбыўся прыём грамадзян. Да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуліся жыхары Магілёўскай вобласці. Іх хвалявалі пытанні патрыятычнага выхавання моладзі і ўвекавечання памяці, працаўладкавання, руху транспарту і інш. Напрыклад, бабруйчанін прапанаваў на базе гарадскога медыцынскага каледжа зрабіць медыцынскую групу для навучання інвалідаў па зроку лячэбнаму масажу. Заяўнікі з Магілёва папрасілі садзейнічаць у перадачы ва ўласнасць грамадзян 14 аднапакаёвак у жылым доме па Пушкінскім праспекце — былым інтэрнаце спецкамендатуры. Усе пытанні ўзятыя на кантроль і будуць разгледжаны ў вызначаны заканадаўствам час.

Што датычыцца актыўнасці зваротаў грамадзян у органы ўлады, то, па словах **начальніка ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Іны ФІЛІПАВАЙ,** на 19 сакавіка ў органы ўлады паступіла 689 зваротаў — на 6 % менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Людзі звярталіся як асабіста, так і праз электронны зварот. Апошняя форма, дарэчы, карыстаецца не меншым попытам, чым вусная. Лідзіруюць пытанні, якія датычацца добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, рамонту дарог, эксплуатацыі жылфонду, аплаты паслуг. На фоне агульнага зніжэння колькасць зваротаў, звязаных з ЖКГ, на 13 % павялічылася. Актуальнымі застаюцца пытанні архітэктуры і будаўніцтва, аховы здароўя, працы і занятасці.

— Мы тлумачым насельніцтву, што ўсе пытанні трэба адрасаваць па прыналежнасці, — адзначыла Іна Філіпава. — І людзі нас чуюць. Вядома, што многія жадаюць трапіць на прыём да вышэйстаячага кіраўніцтва, але ўсе разумеюць, што вырашацца праблемы будуць усё роўна на мясцовым узроўні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

Блізкая ўлада

# ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

**На сустрэчу з памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па горадзе Мінску Аляксандрам БАРСУКОВЫМ у Мінгарвыканкаме паспелі запісацца больш за 30 чалавек, паведамляе БелТА.**

«Можна і яшчэ запісацца. У нас час не абмежаваны, будзем прымаць хоць да позняй ночы, пакуль людзі будуць прыходзіць. Кожнага выслухаем і дапаможам, чым зможам, — запэўніў Аляксандр Барсукоў. — Але, мяркуючы па пытаннях першых людзей, якіх я паспеў прыняць, можна зрабіць невялікі зрэз. Першае, што хвалюе грамадзян, — пытанні ЖКГ».

Некаторыя праблемы, якія датычацца якасці камунальных паслуг, атрымалася вырашыць ужо падчас прыёму. Напрыклад, па вывазе смецця з прыдамавых тэрыторый. Праблема, як аказалася, была ў няправільна прыпаркаваным аўтамабілі, з-за чаго смеццявоз не мог пад'ехаць. «Гэта тэма больш Дзяржаўтаінспекцыі. Пытанне мы прагаварылі, думаю, што машыну проста эвакуіруюць», — сказаў памочнік Прэзідэнта.

Таксама, паводле слоў Аляксандра Барсукова, нямала людзей ва ўзросце прыходзяць са сваімі перажываннямі з нагоды таго, як працуюць і як будуць далей працаваць медустановы ва ўмовах пандэміі.

Актуальнае пытанне — навядзенне парадку. «Людзі абураюцца, што горад добраўпарадкуецца, днём наводзіцца парадак, а ўначы нейкія вандалы наносяць на фасады будынкаў надпісы. У прыватнасці, камусьці зрабілі капрамонт у доме з уцяпленнем тэрмашубай, усё прыгожа, а раніцай — надпісы на будынку. Людзі правільна абураюцца. Я хацеў бы такіх хуліганаў папярэдзіць: іх дзеянні цягнуць наступствы. І гаворка ідзе нават не пра адміністрацыйную адказнасць, а пра крымінальную. Такое хамства ніхто цярпець не будзе, час дамаўленняў скончыўся», — падкрэсліў Аляксандр Барсукоў.

У цэлым, паводле яго слоў, менавіта пры асабістых зносінах чалавек мае магчымасць пагаварыць пра сваю праблему, сказаць, што яго сапраўды хвалюе.

Ва ўрадзе

# ПАПЯРЭДЗІЦЬ КОЖНАЕ ДЗІЦЯ

## На Камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў абмеркавалі меры прафілактыкі дзіцячай злачыннасці

**«Статыстыка мінулага года і звесткі па лютым бягучага сведчаць пра зніжэнне росту злачынстваў, якія здзейснілі непаўналетнія, па выніку лютага — на 5,6 працэнта. У тым ліку зніжаецца колькасць выпадкаў прыцягнення непаўналетніх да ўдзелу ў злачынствах, — расказаў перад пасяджэннем камісіі журналістам намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА. — Тым не менш нас гэта не расхалоджвае».**

На пасяджэнні, якое часткова праходзіла ў рэжыме анлайн, разгледзелі вынікі арганізацыйных і прафілактычных мерапрыемстваў, якія прымаюцца па ўсёй вертыкалі функцыянавання Камісіі па справах непаўналетніх ад раёнаў да рэспублікі. Удзельнікі нарады абмеркавалі дадатковыя меры для выпраўлення дзяцей і падлеткаў, якія ўжо парушылі закон. Была прааналізавана работа па абмежаванні доступу непаўналетніх да дэструктыўных інтэрнэт-сайтаў.

Прадстаўнік Міністэрства аховы здароўя звярнуў увагу на барацьбу з алкагалізмам і наркаманіяй у маладзёжным асяроддзі. Яшчэ адзін пункт парадку дня сустрэчы — пытанні працаўладкавання юнакоў і дзяўчат.

«Гэта важны элемент, бо аналіз паказаў, што большую частку злачынстваў моладзь здзяйсняе ў выхадныя дні», — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Комплекс прафілактычных мер, па яго словах, даў магчымасць знізіць злачыннасць сярод непаўналетніх.

«У апошнія гады нам удалося дабіцца пэўных пазітыўных вынікаў у папераджальна-прафілактычнай рабоце. Гэтаму садзейнічала ажыццяўленне комплексу выхаваўча-прафілактычных і арганізацыйна-практычных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў адпаведнасці з канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі, розных рэгіянальных комплексаў мер і праграм прафілактычнай накіраванасці. Усё гэта аказала ў цэлым пазітыўны ўплыў на стан і дынаміку злачыннасці», — канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра.

У сувязі з гэтым Ігар Петрышэнка лічыць, што дадатковых мерапрыемстваў, комплексаў мер і праграм такога характару на сёння ўжо не патрабуецца, а неабходна сканцэнтравацца на якасці іх выканання, на ўвазе да кожнага дзіцяці.

«На змест выхаваўча-прафілактычнай работы, безумоўна, паўплываюць новыя нормы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія ўступілі ў сілу 1 сакавіка бягучага года, і ў першую чаргу прымяненне мер выхаваўчага ўздзеяння да непаўналетніх, вызваленых ад адміністрацыйнай адказнасці. Гэта патрабуе ад суб'ектаў прафілактыкі якасна новых падыходаў папераджальна-прафілактычнай работы», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Замест штрафу — тлумачэнне заканадаўства, публічнае прабачэнне, загладжванне віны, абмежаванне ў нейкіх мерапрыемствах (па рашэнні суда да 30 дзён). Намеснік прэм'ер-міністра назваў усё гэта важнымі элементамі дэкрыміналізацыі адміністрацыйнага і крымінальнага заканадаўства ў адносінах да падлеткаў.

«Гэта значыць, мы даём яшчэ адзін шанц, каб тыя маглі выправіцца, — сказаў ён. — Разам з тым закон узмацняе адказнасць бацькоў і апекуноў за паводзіны дзяцей, у тым ліку за прыцягненне на несанкцыянаваныя мерапрыемствы. Ёсць адпаведная карэкціроўка Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Гэта таксама ў полі зроку нашай камісіі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Грамадская думка

**Сяргей МУСІЕНКА:**

# «Адбылася змена сацыяльнага мыслення»

Эксперт пракаментаваў вынікі маштабнага сацапытання

**Па заказе БелТА з 12 студзеня да 8 лютага 2021 года Аналітычным цэнтрам EcooM з прыцягненнем фонду «Украінская палітыка» і ва ўзаемадзеянні з акрэдытаванымі ў Беларусі сацыялагічнымі цэнтрамі праведзена рэспубліканскае апытанне грамадскай думкі «Сацыяльнае мысленне». Чарговыя апрацаваныя даныя карэспандэнту БелТА пракаментаваў дырэктар Аналітычнага цэнтра EcooM Сяргей МУСІЕНКА.**

Згодна з сацдаследаваннем, матэрыяльнае становішча за апошні год не змянілася ў 29,2 працэнта беларусаў, палепшылася і крыху палепшылася — у 14,9 працэнта.

«Гэта вельмі сур'ёзная лічба. І тое, што не змянілася, — таксама высокая лічба», — адзначыў Сяргей Мусіенка.

Рэспандэнтам таксама прапаноўвалася адказаць на адкрытае пытанне: калі ваша жыццё пагаршаецца, хто ў тым вінаваты? «Няма адказу ў 32,8 працэнта. Ускосна гэта сведчыць аб тым, што жыццё і не пагаршаецца. Гэтае пытанне для людзей не стаіць. Вінаватыя мы самі — адказалі 16,9 працэнта. Гэта, вядома, звяртае на сябе ўвагу. Таму што 25 гадоў назад мы лічылі, што гэта дзяржава перад усімі вінаватая, а толькі не мы. Такі адказ сведчыць аб тым, што адбылася змена сацыяльнага мыслення, адбываюцца глабальныя зрухі. Традыцыйна абвінавачваюць дзяржаву 7,4 працэнта. Але заўважце, палітычная апазіцыя ў адказе на гэта пытанне набірае ўжо 7,3 працэнта. Гэта значыць, яе заклікі пагоршыць нашае жыццё зразуметыя людзьмі: крыкі аб тым, што трэба спыніць прадпрыемствы, трэба зрабіць нам горш, санкцыі ўвесці. А супраць каго санкцыі? Супраць нас? Вербальная эканамічная інтэрвенцыя з адмоўным вынікам. Чым больш гэтая праслойка палітычнай апазіцыі будзе займацца такімі рэчамі, названы працэнт будзе расці. І заўважце, Прэзідэнт краіны — 4,5 працэнта — гэта пры апытанні 10 тысяч чалавек. Гэта сведчыць пра многае. І 2,9 працэнта апытаных лічаць, што ўрады іншых краін вінаватыя, што мы жывём горш. Бо мы бачым актыўныя заклікі ўрадаў іншых краін зрабіць нам горш, бачым умяшанне ў нашы справы і людзі гэта таксама адзначаюць», — лічыць Сяргей Мусіенка.

Важны момант: віна на органы мясцовай улады ўскладаецца адным працэнтам беларусаў, на прадпрымальнікаў — 0,2 працэнта. «І вось гэты велізарны разрыў, што практычна 17 працэнтаў ускладаюць віну на сябе, а вось пра прадпрыемствы, мясцовую ўладу неяк асоба не ўспомнілі. Такое адчуванне, што іх не відаць, не чуваць. Ледзь што, адразу Прэзідэнт або дзяржава ў цэлым. Але ў чым яны правініліся, у чым іхная віна? Вельмі сур'ёзнае пытанне», — канстатаваў дырэктар EcooM.

Калі ў найбліжэйшай будучыні эканамічная сітуацыя пагоршыцца, то 63,5 працэнта беларусаў адзначылі, што будуць самастойна шукаць шляхі паляпшэння свайго жыцця. «І гэта велізарны поспех, на мой погляд. Гэта значыць, людзі разумеюць, што многае залежыць ад кожнага асабіста. І гэта ўжо вельмі высокі працэнт. Значыць, развіццё дзяржавы і грамадства ідзе ў правільным напрамку», — падкрэсліў эксперт.

Яшчэ адно пытанне: што неабходна для вырашэння праблем, якія стаяць перад беларускім грамадствам сёння? Абранне новага Прэзідэнта — 6,8 працэнта. Павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання і ідэалогіі — 5,8 працэнта. Адказ — дастойная аплата працы — 7,2 працэнта... 3,9 працэнта хацелі б спыніць масавыя пратэсты. 2,6 працэнта лічаць нацыянальнае адзінства важным фактарам, на які трэба звярнуць увагу. За змяненне формы праўлення ў бок парламенцкай рэспублікі выступаюць 0,7 працэнта апытаных. Вярнуцца да Канстытуцыі 1994 года пажадалі толькі 0,2 працэнта беларусаў.

Далей ідуць пытанні краіназнаўчага блока. У прыватнасці, рэспандэнтам прапаноўвалася ацаніць дзеянні краін і аб'яднанняў у адносінах да падзей у нашай краіне. «56,1 працэнта апытаных лічаць, што адносіны з Расіяй развіваюцца станоўча і хутчэй станоўча... Хутчэй адмоўна і адмоўна — невысокі працэнт, 9 працэнтаў і 7,5 працэнта адпаведна. Гэта паказальна. Што вельмі моцна адрозніваецца ў цэлым ад адносін да дзеянняў Еўрапейскага саюза. Заўважце, адмоўна і хутчэй адмоўна — практычна 40 працэнтаў пры 30 працэнтах тых, каму складана было адказаць, і толькі станоўча — 7,3 працэнта. Вядома, дзеянні ЗША — яшчэ менш — станоўча і хутчэй станоўча ацэньваюць 11,6 працэнта... Што кардынальна таксама адрознівае адносіны да пазіцыі Кітая. Больш як 45 працэнтаў лічаць яе станоўчай. Гэта супастаўна з Расіяй. Асобна — краіны Балтыі. І ў цэлым, і паасобку іх ацэнка вельмі нізкая. Пазіцыю Польшчы насельніцтва таксама дакладна разумее. Ва Украіне і Вялікабрытаніі таксама прэваліруе адмоўная лічба. Гэта значыць калі краіны займаюць нейкую антыпазіцыю незразумела чаму, тое людзі заўважаюць», — акцэнтаваў эксперт.

На пытанне, якія крыніцы інфармацыі вы выкарыстоўваеце, беларусы адказалі наступным чынам: сацыяльныя сеткі — 38,9 працэнта, тэлебачанне — 57,2 працэнта, сайты інфармацыйныя і навін — 52,3 працэнта, месенджары — 38,7 працэнта, друкаваная прэса — 27,6 працэнта, радыё — 14,3 працэнта. «І далей — дакладнасць, аператыўнасць, актуальнасць. Таксама, на мой погляд, паказальнае пытанне. Паглядзіце, аператыўнасць: сацыяльныя сеткі — 39 працэнтаў, месенджары — 37,2 працэнта. Але дакладнасць — адпаведна 19,2 працэнта і 15,4 працэнта. А друкаваная прэса тут карыстаецца большай павагай і даверам — 37,8 працэнта», — дадаў Сяргей Мусіенка.

Будзь у курсе!

## Смалявічы стануць яшчэ больш даступныя

**У мэтах павышэння ўзроўню транспартнай даступнасці Мінскага рэгіёна і ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 25.04.2012 года № 202 «Аб мерах па развіцці перавозак пасажыраў чыгуначным транспартам агульнага карыстання» (са змяненнямі ад 18.01.2021) з 28 сакавіка маршрут цягнікоў гарадскіх ліній Мінск — Смалявічы прадаўжаецца да станцыі Чырвоны Сцяг з прыпынкам на прыпыначным пункце Зарэчнае, які размешчаны ў межах горада-спадарожніка.**

Продаж квіткоў адкрыецца з 0.00 гадзін 28 сакавіка, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Для зручнасці і бяспекі пасажыраў цягнікоў гарадскіх ліній, а таксама стварэння ўмоў для перасадкі ў гарадскі грамадскі транспарт у 2023 годзе будзе выканана рэканструкцыя прыпыначнага пункта Зарэчнае з прыцягненнем бюджэтных крыніц фінансавання.

Падаўжэнне маршруту руху дазволіць забяспечыць поўны ахоп Смалявіч чыгуначным транспартам з улікам існуючага і перспектыўнага попыту на перавозкі ў гарадскіх межах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЯМА СМАЧНЕЙШАЙ ВАДЗІЦЫ, ЯК З РОДНАЙ КРЫНІЦЫ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Па выніку першага цыкла работ інвентарызавана 8000 водных аб'ектаў — прыкладна 20 % ад агульнай колькасці ў краіне. Гэта 3298 рэк, 2313 азёр, з якіх амаль палова (1360) у Віцебскай вобласці, 85 вадасховішчаў, 1931 сажалка і 1183 крыніцы.

— У інвентарызацыі актыўна дапамагалі грамадскія аб'яднанні. Летась у межах акцыі «Раскажы пра сваю крыніцу» мы правялі конкурс на найлепшыя работы па інвентарызацыі крыніц малой радзімы, у якой маглі ўдзельнічаць абсалютна ўсе беларусы. За два месяцы, пакуль цягнуўся конкурс, у інстытут прыйшло 69 заявак, было даследавана больш за 200 крыніц.

Адзін з асноўных вынікаў леташняй інвентарызацыі крыніц — выданне кнігі «Крыніцы Беларусі», дзе ўтрымліваюцца звесткі пра ўсе 1183 крыніцы і найлепшых удзельнікаў конкурсу. Дзесяць найлепшых з іх атрымалі падарункавыя экзэмпляры выдання.

Больш за ўсё праінвентарызавалі крыніц, якія адносяцца да басейна ракі Днепр (гэта самы вялікі басейн у краіне). Даследавалі таксама крыніцы басейнаў Нёмана, Заходняй Дзвіны, Прыпяці і Заходняга Буга.

Дэбіт крыніц ці магутнасць крынічнага ключа — колькасць вады, якая выцякае з крыніцы за адзінку часу, вар'іруецца. Аб'ектаў з буйным дэбітам (магутнасцю звыш за літр у секунду) толькі 10 %. Крыніц, якія «выдаюць» да аднаго літра (ад 100 грамаў да літра ў секунду), 30 %. Больш за ўсё ў Беларусі крыніц з малым дэбітам (0,1 літра ў секунду). Самая буйная ў краіне — Блакітная крыніца ў Слаўгарадскім раёне Магілёўшчыны (яе магутнасць 50 літраў у секунду).

З 2021 да 2025 года інвентарызацыя працягнецца. Спецыялісты звернуць увагу на больш дробныя аб'екты: малыя рэкі, ручаі, азёры, сажалкі, памеры якіх меншыя за 0,5 км$^2$.

— Працягнецца і праца з крыніцамі. Мы плануем распрацаваць канцэпцыю па захаванні і абароне крыніц. Правесці работы па ўстанаўленні прыродаахоўных зон, памер якіх, згодна з Водным кодэксам, — 50 метраў ад месца выхаду падземных вод на паверхню, — падзялілася Алена.

### Сцёкі чыстыя, водазабеспячэнне цэнтралізаванае

За 2016—2020 гады ў краіне ўведзена ў эксплуатацыю 646 станцый абезжалезвання, 49 населеных пунктаў перападключаны да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння, якія маюць якасную пітную ваду.

Для далейшага павышэння якасці вады ў рамках падпраграмы «Чыстая вада» дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе на 2021—2025 гг.» пастаўлены задачы: забеспячэнне спажыўцоў якаснай пітной вадой, арганізацыя цэнтралізаванага водазабеспячэння, павышэнне якасці ачысткі сцёкавых вод і надзейнасці сістэм водазабеспячэння і каналізацыі, запэўніў **Алег КОНАН, генеральны дырэктар «Белводаканал».**

— У найбліжэйшыя пяць гадоў плануецца збудаваць больш за 860 станцый абезжалезвання, а 109 населеных пунктаў перападключыць да сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння. А таксама рэканструяваць 70 ачысных збудаванняў.

Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя, што пакрысе здабыча вады ў краіне памяншаецца. Аднак асноўныя змены, якія датычацца выкарыстання вады, прыходзяцца на прадпрыемствы рыбаводства. Яны змяншаюць выкарыстанне, а некаторыя нават закрываюцца, расказаў **Іван АДЗІКАНКА, загадчык сектара дзяржаўнага воднага кадастра Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага кіравання воднымі рэсурсамі:**

— У студзені запушчана другая пляцоўка Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната. Многія наракалі на гэтае прадпрыемства, але яно паказвае вялікі прырост эканоміі вады, пляцоўка дае 2,9 млрд м$^3$ вады, якая цыркулюецца, у сістэме зваротнага водазабеспячэння. А тэндэнцыя памяншэння аб'ёмаў недастаткова ачышчаных сцёкавых вод — сведчанне таго, што летась было менш аварый на ачысных збудаваннях, і прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць водныя рэсурсы і адводзяць сцёкавыя воды ў паверхневыя водныя аб'екты, больш пільна ставяцца да іх якасці.

У маі на сайце дзяржаўнага абласнога кадастра з'явіцца агульная аналітычная запіска з інфармацыяй пра змены, якія адбыліся ў плане водакарыстання ў абласцях краіны.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кантэйнеравоз сеў на мель і перакрыў Суэцкі канал

Гіганцкі карабель стаў прычынай калапсу на адным з самых загружаных і найважнейшых гандлёвых шляхоў у свеце. Пра гэта паведаміў Bloomberg. Па Суэцкім канале караблі перавозяць велізарную колькасць разнастайных грузаў, аднак кантэйнеравоз Ever Given перакрыў яго цалкам. Судна належыць японскай Shoei Kisen і цяпер знаходзіцца ў доўгатэрміновым кіраванні тайваньскай Evergreen Group. Яно здольнае перавозіць больш за 20 тысяч кантэйнераў і з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце: у вертыкальным становішчы яно вышэйшае за нью-ёркскі хмарачос Эмпайр-стэйт-білдынг. Прадстаўнік Evergreen паведаміў, што на судна, якое рухалася з Кітая ў Ратэрдам, верагодна, абрынуўся моцны вецер, «з-за якога корпус адхіліўся ад рэчышча і сеў на мель». У выніку 400-метровы кантэйнеравоз захрас папярок Суэцкага канала — яго нос заклініла на адным беразе, а карма амаль дакранаецца да другога. Егіпецкія ўлады часова адкрылі маршрут па старым рэчышчы, каб разгрузіць акваторыю.

### Індыйскія медыкі ўпершыню выявілі падвойную мутацыю каранавіруса

Індыйскі кансорцыум па геноме SARS-CoV-2 выявіў у 18 штатах Індыі брытанскі, бразільскі і паўднёваафрыканскі штамы каранавіруса, а таксама знайшоў новы варыянт з двайной мутацыяй. Аб гэтым паведаміла міністэрства аховы здароўя краіны. У кансорцыум, які створаны ў снежні мінулага года, уваходзяць 10 нацыянальных лабараторый, якія праводзяць аналіз геному віруса і выяўляюць новыя варыянты. Складаную мутацыю каранавіруса медыкі выявілі ў штаце Махараштра, які ўжо некалькі дзён лідзіруе па колькасці тых, хто захварэў на ковід.

### Tesla пачала прадаваць машыны за біткоіны

Вытворца электрамабіляў Tesla дазволіў сваім кліентам аплачваць куплю крыптавалютай. Пра гэта ў Twitter паведаміў заснавальнік аўтаканцэрна Ілан Маск. На афіцыйным сайце Tesla удакладняецца, што аплата праводзіцца з біткоін-кашалька кліента: ён можа адсканаваць спецыяльны QR-код або самастойна ўвесці біткоін-адрас і дакладную суму плацяжу. Пры гэтым здзяйсніць аплату можна толькі з аднаго кашалька. Tesla таксама звяртае ўвагу, што опцыя пакуль даступная толькі жыхарам ЗША, кампанія разглядзіць магчымасць адкрыць аплату «крыптай» у іншых краінах у будучыні. Крыптавалюты, апроч біткоіна, да аплаты не прымаюцца. Па курсе, які назначаны на сайце канцэрна, базавая камплектацыя Model S абыдзецца амаль у паўтара «бітка».



# УВАГА: ВАС ЗДЫМАЕ ШКОЛЬНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ!

## Праект 2TV

Усё пачалося з газеты, якую ў школе пачалі выпускаць некалькі гадоў таму. Над нумарамі працуюць школьнікі, а каардынуе іх работу бібліятэкар Дар'я Лызо. Нумары размяшчаюцца на сайце ў электронным выглядзе. Папяровы варыянт можна пагартаць у бібліятэцы. Інфармацыі сапраўды шмат. Школьныя журналісты пішуць пра тое, як праводзяць шосты дзень, удзельнічаюць у спаборніцтвах, якія праекты ажыццяўляюць, дзе адпачываюць. Тут жа віншаванні, падзякі, паведамленні. Акрамя асабістага сайта і друкаванай версіі, існуе яшчэ старонка ў сацсетках. І падпісчыкаў там шмат.

— А сёлета мы вырашылі зрабіць тэлеверсію газеты і паспрабаваць укараніць інавацыйны праект — тэлебачанне пад назвай 2TV, — удакладняе **дырэктар школы Таццяна БЕЛАБАРОДАЯ.** — Двойка нагадзе азначае прыналежнасць тэлебачання да нашай школы № 2. Спецыяльнага абсталявання не спатрэбілася. Ва ўсіх дзяцей ёсць мабільныя тэлефоны, праграмкі для мантажу можна знайсці ў інтэрнэце, інтэрактыўныя дошкі можна выкарыстоўваць замест экрана, а сацсеткі — для эфіру. Укладанняў, як бачыце, амаль ніякіх, затое карысці шмат. Развіваем камунікатыўныя здольнасці нашых дзяцей. Пакуль мы толькі ў пачатку шляху, але ўжо цяпер можна казаць пра першыя поспехі. Праект дазваляе навучыць дзяцей размаўляць, аналізаваць, даведвацца пра нешта новае. Ды і наогул, працаваць на камеру не так проста. Трэба прадумваць кожны крок, умець нешта сказаць.

Думкі ўкараніць нешта падобнае ў настаўнікаў школы былі і раней, але штуршком стаў менавіта конкурс, які аб'явілі раённых аддзелы адукацыі і ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Конкурс, дарэчы, датычыўся сацыяльных праектаў па прафілактыцы правапарушэнняў і злачынстваў. А што можа быць больш дзейсным, чым прафілактыка з дапамогай тэлебачання?

— Распрацавалі адпаведны сацыяльны праект і цяпер яго рэалізоўваем, — кажа **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталля НАВУМОВІЧ,** а па сумяшчальніцтве яшчэ і кіраўнік праекта. — У маі будзем падводзіць вынікі. Плануем ахапіць ім максімальную колькасць дзяцей і стварыць унутраную грамадскую арганізацыю — школьную кінастудыю 2TV. Гэта не значыць, што ўсе будуць карэспандэнтамі. Нам сёння вельмі не хапае артыстаў. І цяпер мы рыхтуем для сябе будучых зорак. Наогул, для тэлебачання патрэбна шмат розных спецыяльнасцяў. І мы ведаем, што без ініцыятывы дарослых дзеці самі нічога не змаглі б зрабіць. Нават будучыя «кадры» трэба правільна адабраць, ацаніць здольнасці вучня. І нашы настаўнікі сёння гэтым займаюцца. Ёсць усе спадзяванні, што праект будзе вельмі цікавы і ўплывовы.

## Сам сабе рэжысёр

Тэм для рэпартажаў хапае. Нават нагадаць лішні раз пра тое, каб не смецілі, не перашкодзіць. Але зрабіць гэта не крыўдна, без усялякіх там натацый, у жартаўлівай форме. Спецыяльна пад такія відэа ёсць нават рубрыка «Ролікі не ролікі». Вось, напрыклад, як пераканаць дзяцей, што нельга адмаўляцца ад сняданку? Тутэйшыя вынаходнікі параўналі вучня з мабільным тэлефонам, які разрадзіўся яшчэ да канца ўрокаў і ўжо не мог працаваць. Магчыма, асацыяцыя застанецца і нехта перагледзіць свае адносіны да ранішняга перакусу. Нясумна падаюцца і сацыяльныя ролікі. Стваральнікі імкнуцца ўкласці ў іх як мага больш карыснай інфармацыі. А яшчэ даюць магчымасць пагладзець на сябе збоку. Паказаць, напрыклад, што адбываецца, калі пераходзіць пешаходную «зебру» ў навушніках. Нават інтэрв'ю з пракурорам можна падаць цікава. А заадно папярэдзіць аб адказнасці. Звычайна ўсе ведаюць толькі свае правы.

— Вакол столькі інфармацыі, што не паспяваем усё ахапіць, — усміхаецца Наталля Навумовіч. — Мы зрабілі некалькі раздзелаў, каб паказаць нешта найбольш важнае і карыснае. Адна з такіх рубрык — «Праўнікі перамажцаў». Гэта тэма датычыцца кожнай без выключэння сям'і. У нас шмат інфармацыі пра ветэранаў, у тым ліку і інтэрнацыяналістаў.

У дапамогу 2TV у школе ёсць музей. Там можна даведацца і пра Філіпа Кавалёва, імя якога носіць школа. Ён Герой Савецкага Саюза, перапахаваны на тэрыторыі Клічаўскага раёна. На базе музея працуе гурток «Юны экскурсавод», дзе падлеткі вучаца расказваць пра экспанаты. А яны збольшага адносяцца да ваеннага перыяду. Дарэчы, відэа, дзе юныя экскурсаводы знаёмяць наведвальнікаў з гісторыяй свайго краю, таксама можна знайсці на сайце школы. «Цяпер усе жадаючыя змогуць пабываць у нашым музеі», — радуюцца дзеці.

— А яшчэ ў нас ёсць вельмі добрая традыцыя — Дзень гонару школы, — дадае Таццяна Белабародая. — Гэта вялікае мерапрыемства, якое праводзіцца ў канцы навучальнага года. На яго мы запрашаем сваіх найлепшых вучняў, іх бацькоў, валанцёраў. Уручаем падзячныя лісты, дзякуем за неабыякавасць і стараннасць. Адзначаем усіх, хто сябе хоць у чымсьці праявіў. Тых жа лідараў па збору другаснай сыравіны. Наша школа, дарэчы, здае каля 10 тон макулатуры ў год. А яшчэ збіраем пластыкавыя бутэлькі і асобна накрыўкі — ёсць такая дабрачынная рэспубліканская акцыя, якая дапамагае цяжкахворым дзецям. Падключылі і бацькоў.

## Вермітэхналогіі, модныя калекцыі, міжнародныя праекты

Настаўнікі і вучні Клічаўскай школы № 2 увесь час у нечым удзельнічаюць. Яны першыя ў раёне сталі ўдзельнікамі міжнароднага праекта па стварэнні вермітэхналогій і цяпер распаўсюджваюць вопыт па асновах вермікультывавання.

А яшчэ тут існуе своеасаблівая школа мадэлявання, якую вядзе таленавітая ва ўсіх адносінах майстар-закройшчык Святлана Яшчук. Яна — аўтар моднай калекцыі ў народным стылі з ільну і бавоўны пад назвай «Бабулі дзіўныя ўзоры». Вышытыя спадніцы, аксесуары ў народным стылі — прыгажосць неверагодная! Некалькі гадоў таму майстрыха распрацавала калекцыю для абласнога конкурсу «Залатое вераценца», які праходзіў у рамках Года малой радзімы. «Робім усё гэта з мэтай, каб дзяўчынкі нашы ведалі беларускія народныя традыцыі і не саромеліся іх папулярызаваць. Наша вышыўка адрозніваецца ад той, што ў заходніх рэгіёнах, яна больш сціплая», — кажа настаўніца. А вышывалі гэтыя рэчы і цяпер дэманструюць іх на розных мерапрыемствах яе вучаніцы.

— У нас на ўроках ёсць варыятыўная частка, падчас якой дзяўчаты могуць паглыбіць свае веды і навучыцца вышыўцы крыжам з чыстым спадам. Па гэтым правяраецца майстэрства вучаніцы, — адзначае Святлана Яшчук. Дарэчы, у школе яна працуе ўжо 15 гадоў. Майстрыха на ўсе рукі: можа не толькі кроіць і шыць, але і вязаць кручком, на прутках, займаецца вышываннем, дэкарыраваннем, робіць аплікацыі...

Яшчэ адна калекцыя настаўніцы наогул авангардная — з парасонаў. З такімі ўборамі прыемна гуляць у дажджлівае надвор'е. Святлана Яшчук тым часам дастае з шафы рознакаляровыя спаднічкі і кашулі для школьных мерапрыемстваў. Вось табе і касцюмерная для герояў школьнага тэлебачання. Дарэчы, дзве сучасныя швейныя машынкі школа атрымала за перамогу ў праекце «Рамонак». Яшчэ адну ёй падарыла грамадская арганізацыя «Белая Русь».



Модныя калекцыі Святланы ЯШЧУК.

## Больш за палову настаўнікаў — былыя вучні

Як у адной школе можа працаваць столькі творчых людзей? Настаўнікі толькі ўсміхаюцца ў адказ, маўляў, гэта ўсё традыцыі. 56 % тутэйшых педагогаў — былыя вучні. Некаторыя спецыяльна вучацца на настаўніка, каб потым вярнуцца сюды працаваць. І ўсе без выключэння выпускнікі, калі прыязджаюць дадому на канікулы або святы, стараюцца забегчы сюды хоць на хвілінку. Цікава ж даведацца, што там у іх школе яшчэ незвычайнага прыдумалі.

— Школа наша адносна маладая, існуе з 1971 года, — кажа дырэктар, дарэчы, таксама выпускніца адной са школ гэтага раёна. — Сёння тут вучыцца крыху больш чым 330 вучняў, працуюць 39 педагогаў. Сярэдні ўзрост настаўнікаў — 40 гадоў. І ў кожнага шмат вучняў, з якімі не страчваецца сувязь нават пасля школы. Мы не прывыклі жыць сумна, гэта і ёсць наш галоўны сакрэт і стымул да дзеяння.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

### ❍ Каментарый у тэму

**Святлана ШУТАВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Гэта добры прыклад таго, як павінна працаваць кожная школа — «з агеньчыкам», цікава, пазнавальна. Тут заўсёды рэалізуюць нейкія праекты, ідэі, ініцыятывы. Цудоўны калектыў, таленавітыя і апантаныя ў добрым сэнсе слова дзеці. Наогул, Клічаўскі раён вельмі творчы. Як прадстаўнік гэтай акругі, заўсёды з задавальненнем наведваю тутэйшую школу мастацтваў, дзе працуе шмат творчых людзей. Іх вучні — частыя пераможцы на конкурсах і фестывалях усіх узроўняў. Асабліва гэтай школы яшчэ і ў тым, што тут мае магчымасць займацца нават дарослае насельніцтва.

Братэрства

**Максім ЗАМШАЎ:**

# «Літаратура Беларусі мае сёння сузор'е яркіх імёнаў...»

**З галоўным рэдактарам аўтарытэтнай расійскай «Литературной газеты» мы сустрэліся, каб пагаварыць пра новы праект гэтага выдання.**



***— Выйшаў першы «беларускі выпуск» «Литературной газеты». Чым прадыктавана такое жаданне рэдакцыі добра вядомай і ў Расіі, і на ўсёй постсавецкай прасторы, ды і ва ўсім свеце газеты звярнуцца менавіта да беларускай мастацкай тэмы?***

— Па-першае, «Литературка» заўсёды была звязана з беларускай культурай і літаратурай самым цесным чынам. Многія гады выходзіў пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы дадатак «Лад». І вось цяпер з'явіўся нашчадак «Лада» — «Белые аисты». Рэспубліка Беларусь за апошнія трыццаць гадоў прайшла самабытны культурны шлях. Шлях, які абапіраўся на гістарычную аснову і пры гэтым прымаў у сябе ўсе найлепшыя дасягненні сучаснай мастацкай мовы. І назіраць за гэтым, аналізаваць гэтыя працэсы заўжды вельмі цікава. Па-другое, нам хацелася б зрабіць «Литературную газету» ў Беларусі больш роднай, блізкай, каб чытачы адчувалі пастаяннае сэрцабіццё беларускай культуры, каб змаглі атрымаць асалоду і з таго, наколькі лагічная і перспектыўная інтэграцыя беларускага кантэнту ў расійскае культуралагічнае выданне.

***— Як вы лічыце, сучасная беларуская літаратура будзе цікавая сёння для чытача Расіі?***

— Я проста ўпэўнены ў тым, што і цікавая будзе, і нават надзвычай запатрабаваная. Літаратура Беларусі мае сёння сузор'е яркіх імёнаў, якія лёгка можна аднесці да выдатнай сусветнай плеяды. Ёсць пісьменнікі, якія працуюць даволі даўно, ёсць і маладыя таленты. Сувязь пакаленняў у Беларусі не парушана, і старэйшыя перадаюць малодшым увесь свой вопыт, усе свае здольнасці дзеля таго, каб тыя, хто ідзе следам, высока неслі сцяг славеснасці.

***— У Беларусі ўвагу чытача прыцягвае і класічная літаратура. Толькі за апошнія дзесяцігоддзе розныя мінскія выдавецтвы выпусцілі каля 50 (!) кніг геніяльнага празаіка, паэта, драматурга, публіцыста, перакладчыка Уладзіміра Караткевіча. Ці будзеце пісаць у выпуску «Белые аисты» пра беларускіх класікаў?***

— Так, зразумела, будзем пісаць і пра іх, і новыя пераклады вядомых іх твораў будзем друкаваць. Гэта ж вельмі цікава. І пра Караткевіча не раз напішам, і пра Максіма Багдановіча, і пра Ніла Гілевіча, і пра Янку Купалу, і пра Якуба Коласа, і пра Рыгора Барадуліна, Янку Брыля, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка... Яны ж добра знаёмыя ранейшым пакаленням чытачоў «Литературной газеты».

***— Дарэчы, у наступным, 2022 годзе, — 140 гадоў з дня нараджэня народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Значная падзея для культурнага, асветніцкага жыцця...***

— І мы, вядома ж, не абыдзем увагай гэтыя даты... Летась я пераклаў санеты Янкі Купалы на рускую мову. Для мяне гэты творчы працэс стаўся захапляльным дзействам, поўным эмацыянальнага напружання, сапраўднага гарэння. У беларускай нацыянальнай літаратуры навідавоку цудоўныя карэнні, з якіх вырастаюць магутныя прыгожыя сады.

***— Зразумела, у «Белых аистах» вы будзеце друкаваць не толькі паэзію і прозу... Верагодна, частка «беларускага выпуску» будзе прысвечана пытанням развіцця культуры, розных кірункаў у мастацтве Беларусі?..***

— Мы імкнёмся асвятляць тэатральныя прэм'еры, кінанавінкі, канцэрты, а таксама мерапрыемствы ў сучасных фарматах. Культура — гэта тое, што ўсім нам дапаможа пераадолець сусветную энтрапію, замяшаную на цынізме і хлусні.

***— А ці будуць у «Литературки» ў Мінску і іншых культурных цэнтрах фарматы невіртуальных зносін з газетай і яе галоўным рэдактарам — паэтам, празаікам, перакладчыкам Максімам Замшавым? Чытач, пагадзіцеся, засумаваў па жывых сустрэчах...***

— Мару сустрэцца з беларускімі чытачамі як мага хутчэй, а таксама хацеў бы паўдзельнічаць і ў іншых сустрэчах, прамадэрыраваць сустрэчы з іншымі аўтарамі «ЛГ» у беларускіх аўдыторыях. Найперш хацелася б прыйсці ва ўніверсітэты і інстытуты, сустрэцца з моладдзю, пагаварыць пра іх зацікаўленні, пагаварыць пра мастацкую літаратуру і ўвогуле пра жыццё.

**Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
25 САКАВІКА 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15905)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Улад РЭКУНОЎ: «ВАША ПАРФУМА — ГЭТА ЧАСТКА ВАС»

**Адчувальны нюх — галоўная «зброя» ў прафесіі парфумера. Некаторыя лічаць іх таленавітымі хімікамі, а для іншых стварэнне ўнікальнага водару — сапраўднае чараўніцтва. Нягледзячы на вялікую канкурэнцыю ў гэтай сферы, прафесійных майстроў — лічаная колькасць, а ў нашай краіне на дадзены момант ён усяго адзін. Як стварыць унікальную парфуму, што будзе падыходзіць менавіта вам, якія кампаненты выкарыстоўваюцца пры стварэнні духоў, чым перашкаджае моцны нюх у звычайным жыцці і пра многае іншае нам распавёў Улад Рэкуноў.**



Калі пераступаеш парог студыі нашага героя, з'яўляецца ўражанне, што прыйшоў у госці да сучаснага алхіміка. На адной сцяне вісіць палічка з мноствам размаляваных флакончыкаў, а на іншай — велізарная колькасць шклянак з рознымі кампанентамі, з якіх і ставарае свае ўнікальныя водары наш суразмоўнік. Але перш за ўсё Улад паказвае нам разварот газеты «The New York Times» за 2014 год, дзе ў артыкуле пад загалоўкам «Эмігранты — гонар Амерыкі» згадваецца беларуска Софія Гройсман — адна з самых тытулаваных парфумераў свету.

— Займацца тым, што цяпер раблю, не было марай майго дзяцінства, але менавіта гэтая жанчына ўнесла вялікі ўклад у тое, каб я стаў прафесіяналам. У мяне эканамічная адукацыя, і спачатку я ніяк не быў звязаны са сферай прыгажосці і мастацтва — для мяне стварэнне духоў уяўляецца менавіта так. Потым па волі лёсу стаў прадаваць оптам парфуму. Гэтым займаўся доўгі час, пакуль у адзін момант не ўсвядоміў, што хачу развівацца далей. Але не як прадавец, а як чалавек, які ставарае ўнікальны пах для кожнага чалавека. Маім першым настаўнікам у дадзенай сферы стаў спецыяліст савецкага парфумерпрама Яўген Пак, які пазней і пазнаёміў мяне з Софіяй Гройсман. Пасля чаго я з'ехаў навучацца на парфумерныя фабрыкі ў Францыі і Бельгіі, дзе тая працавала. Дарэчы, яна тады ставарала водар для Беларусі, але нешта з ім не «зраслося», і прапанавала пашчыраваць над ім, што стала для мяне велізарным гонарам і натхненнем.

У ходзе размовы наш герой прызнаецца, што навучанне парфумернаму мастацтву — справа нялёгкая і не з танных. Затое цяпер у яго ёсць уласная студыя, а кліентамі з'яўляюцца тыя людзі, пра якіх ён і падумаць не мог у пачатку сваёй кар'еры. Сярод іх Валерый Меладзэ, Цімаці, Вольга Плотнікава, Інна Афанасьева і многія іншыя вядомыя артысты.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не вучобай адзінай

## ЯК У 20 ГАДОЎ ПАСПЕЦЬ УСЁ, ці Чаму часам не хапае 24 гадзін у сутках

**Дваццацігадовая Алена КАМІСАРАВА — студэнтка чацвёртага курса Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Гандлёвае абсталяванне і тэхналогіі». Дзяўчына — асоба living разнабаковая: спявае, арганізоўвае мерапрыемствы ў ВНУ, ды і сама ўдзельнічае ў многіх, займаецца навуковай дзейнасцю, да таго ж вучыцца «на выдатна». Адным словам, сапраўдная актывістка. Мы спыталі ў суразмоўніцы, як ёй удаецца так планаваць свой час, чым напоўнены яе будні і што падабаецца ў абранай прафесіі больш за ўсё.**



— Вельмі актыўная, энергічная я яшчэ са школы. У час паступлення адчувала, што калі займацца толькі вучобай, хутка стане сумна, таму, як толькі прадставілася магчымасць прыняць удзел у нечым, праявіць сябе, скарысталася ёю. Усе студэнты ведаюць, што галоўным рухавіком грамадскай дзейнасці ў ВНУ з'яўляецца студсавет, аднак увайсці проста так туды немагчыма. Перш за ўсё трэба зацікавіць сваімі ідэямі, праявіць ініцыятыву па многіх пытаннях. Мне гэта ўдалося, і цяпер я разам з старшыні я крэатыўлю, і ўвасабляю цікавыя задумы разам з камандай. Пачалося ўсё з падзеі DRIVE FMME — мерапрыемства для першакурснікаў. Наваспечаныя студэнты розных спецыяльнасцяў выходзяць і паказваюць тое, на што здатныя. Гэта, дарэчы, адно з самых любімых мерапрыемстваў, пасля яго адчуваю натхненне і прыліў сіл. Яно дае шанц пазнаёміцца бліжэй з тымі, хто, магчыма, у далейшым стане часткай тваёй каманды. «Вясна БНТУ» — таксама любімая падзея, гэта заўсёды напал жарсцяў, спаборніцкі дух. Спачатку сама ўдзельнічала ў гэтым конкурсе, атрымала безліч пазітыўных эмоцый. А зараз ужо і прымаю ўдзел, і рыхтую каманду ад свайго факультэта.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Пераемнасць традыцый

## ЖЫВУЦЬ У СЭРЦАХ СТУДАТРАДЫ...

У аднолькавай ступені — што ў членаў ранейшага УЛКСМ, што ў цяперашняга БРСМ

**Часта кажуць, што моладзь — аснова краіны, яе будучыня. Наша Айчына заўсёды ганарылася актыўнымі юнакамі і дзяўчатамі, якія хацелі развіваць і рабіць гэтую самую будучыню лепшай. На сёння шэфства над такімі зацікаўленымі ўзяў на сябе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Сучасныя юнакі і дзяўчаты бяруць добры прыклад любові да працы ад папярэднікаў, ветэранаў студатрадаўскага руху. Гэтак жа як і «Чырвонка», якая 21 красавіка адсвяткуе свае 100-годдзе, падхапіўшы творчую эстафету ад ранейшых журналістаў, працягвае пісаць пра яго найлепшых прадстаўнікоў. Аб гісторыі, пераемнасці традыцый і буднях былых будаўнічых атрадаў расказала дырэктар музея гісторыі камсамола і маладзёжнага руху Беларусі Святлана САСНІНА:**



— У 1963 годзе ўпершыню больш за 2 тысячы студэнтаў з шасnаццаці ВНУ Беларусі выехалі ва Уральскую вобласць, каб унесці свой уклад у асваенне цалінных зямель. Там яны пабудавалі 100 жылых дамоў, 18 інтэрнатаў, 34 культурна-бытавыя аб'екты, восем школ. Па выніках працоўнага семестра 37 беларускіх студэнтаў узнагародзілі медалём «За асваенне цалінных зямель». Вельмі адказным для маладых людзей стаў 1974 год. Менавіта тады ў красавіку было абвешчана аб будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі (БАМ). Гэта была смелая і надзвычай складаная задача, патрабавалася пракласці больш за 4 тысячы кіламетраў чыгуначных пуцей, зрабіць дзясяткі больших мастоў і тунэляў, пабудаваць звыш 60 гарадоў і пасёлкаў. Уся моладзь ад Брэста да Уладзівастока марыла трапіць на «Усесаюзную ўдарную будоўлю», гэта было прэстыжна. Паехаць туды было не толькі выпрабаваннем на трываласць, але і асаблівай працоўнай рамантыкай.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
25 03 2021 г.

*Нефармат*

# «ЭВАЛЮЦЫЯ» ПА-БАБРУЙСКУ

## Як навучыцца размаўляць з падлеткамі на адной мове

**«Дунін-квэст! Што табе кажуць гэтыя словы? Акей, нават калі ты і не ведаеш, мы табе дапаможам. Зусім хутка пройдзе наш новы супер-мега-квэст. Калі ты любіш шыфры і загадкі, гісторыю і літаратуру або табе падабаецца проста бавіць час з сябрамі на свежым паветры — рэгіструйся...» Такая абвестка з'явілася нядаўна ў сацыяльных сетках на старонцы нефармальнага студэнцкага цэнтра «Эвалюцыя», створанага год таму ў Бабруйску. Вы можаце запытаць, адкуль студэнцкі цэнтр у горадзе, дзе няма ВНУ?**

### НАВОШТА МЫ ГЭТА РОБІМ?

— Так, насамрэч у двухсоттысячным Бабруйску, пасля закрыцця філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы, — кажа Наталля ХАЛАНСКАЯ. — Таму, на жаль, выпускнікі школ едуць у іншыя гарады для атрымання там вышэйшай адукацыі і не ўсе вяртаюцца назад. Але пры гэтым у Бабруйску дзейнічае шмат сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, дзе навучаюцца прыкладна 12 тысяч чалавек — гэта не толькі жыхары нашага горада.

Ідэя стварэння нефармальнага студэнцкага цэнтра «Эвалюцыя» з'явілася не на пустым месцы. Сама Наталля, як і многія яе равеснікі, калісьці таксама накіравалася вучыцца ў Мінск, але праз дзесяць гадоў жыцця ў сталіцы вярнулася ў родны горад і... адкрыла там свой бізнес.

— Пасля вяртання мне здалося, што ў горадзе нічога не адбываецца. Не было куды пайсці, каб сустрэць аднадумцаў і знайсці цікавыя стасункі, — прызнавалася Наталля. — Так і з'явілася ідэя камерцыйнага праекта з сацыяльным ухілам. Выбраць нешта канкрэтнае для бізнесу было няпроста. Мне хацелася займацца і адукацыяй, і культурай, і ствараць магчымасці для іншых. Так я прыйшла да ідэі антыкавярні — прасторы, дзе будуць збірацца актыўныя гараджане, дзе можна сустрэць цікавых людзей, прыдумаць сумесныя праекты. У 2014 годзе свае дзверы для першых наведвальнікаў адчыніў тайм-клуб «1387» (гэта год адной з першых згадак Бабруйска ў летапісах ВКЛ). Сёння ён аб'ядноўвае фарматы адукацыйнага цэнтра і цэнтра адпачынку для дарослых і падлеткаў. А год таму на яго плошчах запрацаваў нефармальны студэнцкі цэнтр «Эвалюцыя».

Першапачаткова мы цікавіліся, дзе бавяць свой час падлеткі. Высветлілася, што вельмі папулярнымі месцамі ў іх з'яўляюцца паркінгі побач з гандлёвымі цэнтрамі, дзе яны сядзяць, як верабейчыкі на агароджы, або фае гандлёвых цэнтраў (асабліва ў халодны час года). Яны там пачуваюць сябе дастаткова камфортна, тусуюцца, слухаюць музыку. Збіраецца моладзь таксама на плошчах і ў дварах. Мы вырашылі прапанаваць ім сваю прастору, дзе яны змогуць займацца тым, што ім цікава, без нейкіх абавязковых фарматаў.

«Той, хто думае, што калі падлеткам няма куды пайсці, дык што б ты ім ні прапанаваў, яны абавязкова прыйдуць, памыляецца. Гэта не працуе. Калі падлеткі не давяраюць, не адчуваюць, што гэта іх месца, яны не прыйдуць, а калі і прыйдуць, то надоўга не затрымаюцца, — канстатуе Наталля. — Таму мы спачатку выбралі адзін дзень на тыдзень — аўторак, калі падлеткі могуць завітаць да нас, сагрэцца, выпіць гарбаты з печывам, пагуляць у настольныя гульні, паглядзець кіно ва ўтульнай абстаноўцы. А потым пачалі ім прапаноўваць розныя актыўнасці. Навошта мы гэта робім? Нам хочацца сфарміраваць супольнасць актыўнай моладзі, якая ініцыюе і рэалізуе праекты для сябе і для горада, моладзі, якая добра арыентуецца ў свеце сучасных прафесій».



### ВАЖНЫЯ НАВЫКІ

Напрыклад, навучэнцаў запрашаюць на сустрэчы з прадстаўнікамі новых і незвычайных прафесій, якія расказваюць, як у выніку дадатковай адукацыі і самаразвіцця яны асвойвалі новыя кірункі. У гасцях была стваральніца адзінага на дадзены момант у Бабруйску квэструма Вікторыя Жураўлёва, якая расказала, што такое квэструм, якія яны бываюць, што неабходна для іх стварэння і ад якіх абставін залежыць поспех. Пра прафесію эколага падлеткам распавядаў Ігар Куталоўскі, эксперт экалагічнага таварыства «Зялёная сетка». Акрамя лекцый-сустрэч, падлеткам таксама прапануюць Job Shadows Day — аднадзённыя міні-стажыроўкі ў прадпрымальнікаў Бабруйска. Гэта не проста знаёмства з прадстаўнікамі розных прафесій, але і магчымасць пагрузіцца ў працэс работы, даведацца пра ўсе яе нябачныя нюансы. У падлеткаў была магчымасць «хадзіць як цень» за інжынерам-тэхнолагам на прадпрыемстве, якое займаецца дрэваапрацоўкай і вырабам мэблі, работнікамі кафэ, спецыялістам па камунікацыі ў фітнес-індустрыі, эколагам, дызайнерам інтэр'ера, журналістамі гарадскога інтэрнэт-партала, гульнепрактыкам. Ад апошняга падлеткі даведаліся, што гульні — гэта не проста вясёлае баўленне часу, але і сур'ёзны псіхалагічны інструмент.

Яшчэ адзін кірунак — курс Soft Skills па развіцці так званых мяккіх, або сацыяльных, навыкаў. Размова ідзе пераважна пра ўзаемадзеянне паміж людзьмі. Маюцца на ўвазе такія якасці, як гібкасць, уменне працаваць у камандзе, стрэсаўстойлівасць, уменне папярэджваць і «гасіць» канфлікты, гатоўнасць браць на сябе адказнасць, аргументавана дыскутаваць, весці перамовы, фармуляваць мэты і ставіць задачы, самаарганізацыя, гатоўнасць прыстасоўвацца да інавацый, быць эфектыўным. Чамусьці да гэтага часу большасць людзей думае, што поспех залежыць выключна ад узроўню прафесіяналізму, але ёсць меркаванне, што паспяховасць чалавека ў прафесійнай сферы на 85 працэнтаў залежыць менавіта ад soft skills.

### САРАФАННАЕ РАДЫЁ

Не менш важны кірунак дзейнасці цэнтра «Эвалюцыя» — курс для падлеткаў Project Management. Пасля яго заканчэння ладзіцца публічная прэзентацыя аўтарскіх ідэй. Гэта адкрытыя гарадскія мерапрыемствы, куды можна запрасіць родных і сяброў. А ў якасці экспертаў выступаюць прадстаўнікі прадпрымальніцкай супольнасці. Сёння ў рабоце знаходзіцца пятнаццаць ідэй. Адна з іх — тэатральная тэрапія. Падлеткі кажуць, што ў іх няма месца, дзе яны маглі б выліць свае эмоцыі. І такім месцам мог бы стаць тэрапеўтычны тэатральны гурток, дзе можна бяспечна выказваць свае эмоцыі праз акцёрскія практыкі. Зараз гэтая ідэя абмяркоўваецца з акцёрамі гарадскога тэатра.

Праект ArtSoup таксама быў прапанаваны падлеткамі. У іх утварылася суполка, дзе яны свабодна перадаюць свае эмоцыі на паперы і не вельмі вітаюць умяшанне звонку. Зараз працуюць над тэмай булінгу. Мяркуецца, што з'явіцца калекцыя паштовак на гэтую тэму і будзе арганізавана выстаўка іх работ. Шмат праектаў датычацца арганізацыі ў горадзе велараху і прасторы для актыўных відаў спорту. Як заўважае Наталля, не заўсёды для рэалізацыі ідэй падлеткаў патрабуюцца вялікія сродкі.

Нядаўна прайшоў прававы квэст «Эфект матылька» на тэму дамашняга гвалту. Самая складаная задача і ў гульні, і ў жыцці — прадухіліць такую сітуацыю. Для гэтага трэба ўмець казаць і слухаць, назіраць і аналізаваць паводзіны іншых, тлумачыць і дамаўляцца пра шляхі вырашэння праблемы. А ў гульні, пражываючы пэўную сацыяльную ролю, адпрацаваць гэтыя ўменні прасцей. Увогуле прававая граматнасць аказалася самым складаным кірункам у рабоце з моладдзю, таму гейміфікацыя тут вельмі дапамагае. У цэнтры «Эвалюцыя» распрацавана серыя квэстаў і квізаў на прававыя тэмы. Высветлілася, напрыклад, што маладых людзей хвалюе не толькі тэма булінгу, але і тэма мобінгу. Падлеткі, якія яшчэ навучаюцца ў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных установах, занепакоеныя тым, ці змогуць яны ўліцца ў свой першы працоўны калектыў, ці прымуць іх там старэйшыя калегі? Падчас аднаго з квізаў яны выступалі ў ролі экспертаў і «раскручвалі» гісторыю маладога спецыяліста, які з нярвовым зрывам трапіў у бальніцу.

— Мы адштурхоўваемся у першую чаргу ад запытаў сяброў нашага цэнтра, — падкрэслівае Наталля Халанская. — У маёй камандзе працуюць маладыя людзі ад 20 да 25 гадоў, менавіта яны і прапанавалі працаваць з падлеткамі. Ім прасцей выбудоўваць з імі адносіны, паколькі размаўляюць з гэтай аўдыторыяй на адной мове. Ведаюць, па якіх каналах распаўсюджваць інфармацыю аб мерапрыемствах. **Наша прынцыповая пазіцыя: усе актыўнасці для ўдзельнікаў нефармальнага студэнцкага клуба — бясплатныя.** Гэта тая аўдыторыя, якая не мае ўласных грошай.



Пераканаліся, што вельмі хутка інфармацыя пра цэнтр распаўсюджваецца ў гісторыях у «Інстаграме». Яшчэ ў падлеткаў шмат сваіх унутраных чатаў (яны іх называюць «флудзілкамі»). Таму, калі вы жадаеце працаваць з моладдзю і прапаноўваць ім нейкія актыўнасці, вам абавязкова трэба трапіць у такія «флудзілкі». Яны працуюць як сарафаннае радыё: падлеткі запрашаюць адзін аднаго далучацца. Прыкладна 20 працэнтаў сяброў цэнтра самі пастаянна штосьці ініцыююць, яшчэ 40 працэнтаў з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх мерапрыемстваў. Калі ёсць ідэі для горада, але не хапае ведаў, як іх рэалізаваць, дзе знайсці для гэтага рэсурсы, мы запрашаем у нефармальны студэнцкі цэнтр «Эвалюцыя». Сумна ў нас дакладна не будзе!

**Фота са старонак цэнтра ў сацыяльных сетках.**

*Магчымасці*

# АСНОВЫ БІЗНЕСУ ДЛЯ МОЛАДЗІ

**Стартуе новы сезон праграмы па развіцці маладзёжнага прадпрымальніцтва Youth Empowered-2021. Міжнародны праект штогод аб'ядноўвае маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 29 гадоў, каб дапамагчы ім развіць бізнес-навыкі, прасунуцца па кар'ернай лесвіцы і адкрыць уласную справу.**

У Беларусі праграма будзе праводзіцца пяты год запар. З 2017 года навучанне прайшло больш за 3,5 тысячы маладых беларусаў, 64 зарэгістравалі ўласны бізнес у сферах прыгажосці, пашыву і вытворчасці адзення, медыя, IT, рознічнага гандлю і грамадскага харчавання.

Сёлета ў праграме запланавана 28 аднадзённых бізнес-трэнінгаў, якія пройдуць з сакавіка да снежня. Сустрэчы будуць праводзіцца ў анлайн- і афлайн-фарматах. Удзел у праграме Youth Empowered бясплатны.

Змест трэнінгаў скіраваны на развіццё персанальных навыкаў, неабходных кіраўніку (гэта кампетэнцыі лідара, майстэрства публічных выступленняў, навыкі дзелавых адносін, фарміраванне каманды і г. д.), на атрыманне практычных ведаў аб вядзенні бізнесу ў розных галінах і фарміраванне ўяўлення пра ўніверсальныя інструменты развіцця праектаў (маркетынг, продажы, пазіцыянаванне брэнда).

У якасці спікераў праграмы запрашаюцца ўладальнікі бізнесу і прадпрымальнікі, топ-менеджары і бізнес-коўчы. Так, у гэтым сезоне сярод ментараў будуць кіраўнік рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская палата моды», рэжысёр, заснавальнік і кіраўнік праекта Belarus Fashion Week Яніна Ганчарова, стваральнік і ідэйны натхняльнік Coffee Fest Belarus, уладальніца сеткі кавярняў Guru Coffee Марына Васкрасенская.

Мэта праграмы Youth Empowered Coca-Cola HBC — развіццё патэнцыялу маладзёжнага прадпрымальніцтва. Праект рэалізоўваецца ў 28 краінах.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Свая вышыня

# ПАВЫШАЮЧЫ ПРЭСТЫЖ ПРАФЕСІІ,

## або Як маладыя водзяць цягнікі

**Беларуская чыгунка падвяла вынікі спаборніцтва сярод маладзёжных лакаматыўных брыгад па выніках работы за 2020 год. Яго мэта — павышэнне прэстыжу прафесій машыніста і памочніка машыніста, а таксама пастаяннае павышэнне тэхнічнага ўзроўню ведаў лакаматыўных брыгад. Трэба адзначыць, што большасць членаў маладзёжных лакаматыўных брыгад з'яўляюцца членамі БРСМ.**



Усяго ў дарожным спаборніцтве ўзялі ўдзел шэсць брыгад — пераможцаў адборачных тураў, якія праходзілі ў аддзяленнях БЧ.

Удзельнікі ацэньваліся па наступных крытэрыях: забеспячэнне брыгадай выканання графіка руху цягнікоў, нормаў расходу паліўна-энергетычных рэсурсаў, узровень падрыхтоўкі маладзёжнай лакаматыўнай брыгады, удзел машыніста ў правядзенні школ перадавога вопыту і іншыя.

Па выніках спаборніцтва пераможцам стала маладзёжная брыгада лакаматыўнага дэпо «Мінск» Мінскага аддзялення дарогі (машыніст Аляксандр Вянглоўскі і памочнік машыніста Павел Календа).

Другое месца прысуджана маладзёжнай брыгадзе лакаматыўнага дэпо «Гомель» Гомельскага аддзялення беларускай магістралі (машыніст Сяргей Сухоцкі, памочнік машыніста Юрый Кузьменка).

Трэцяга месца ўдастоена маладзёжная брыгада лакаматыўнага дэпо «Ліда» Баранавіцкага аддзялення дарогі (машыніст Генадзь Захватовіч, памочнік машыніста Андрэй Сідорчык).

Пераможцам спаборніцтва будуць уручаны пераходны кубак і дыплом 1-й ступені, а ўладальнікам 2-га і 3-га месцаў — памятныя дыпломы.

Лакацыі актыўнасці

# У Сочы — на будаўнічыя спаборніцтвы

**Байцы беларускіх студэнцкіх атрадаў прымуць удзел у І Міжнародным будаўнічым чэмпіянаце ў Сочы, які пройдзе з 20 да 23 красавіка.**

Запрашэнне беларускаму боку накіраваў Цэнтральны штаб Расійскіх студэнцкіх атрадаў. Каманда павінна складацца з 12 удзельнікаў. Паколькі іх чакаюць сур'ёзныя спаборніцтвы, адбіралі самых падрыхтаваных — тых, хто ведае будаўнічую справу і мае вялікі вопыт удзелу ў будатрадаўскім руху. Касцяк каманды склалі прадстаўнікі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Байцы беларускіх і расійскіх будаўнічых атрадаў будуць спаборнічаць у пяці намінацыях. Агульнакамандныя намінацыі — «Мантаж тэхналагічных трубаправодаў», «Ахова працы», «Агульнабудаўнічыя работы», індывідуальныя — «Неразбуральныя метады кантролю», «Электразваршчык ручной зваркі». Усе яны аб'яднаны ў мультыкамандную намінацыю «Найлепшая пляцоўка па ўзвядзенні». Гэта самая маштабная і відовішчная намінацыя чэмпіянату, у рамках якой адбываецца сімуляцыя рэальнага будаўнічага працэсу на пляцоўцы прамысловага аб'екта. А гэта значыць, што для намінацый будуць створаны асобныя мініі-будаўнічыя пляцоўкі.

Пераможцаў чакаюць каштоўныя прызы. Акрамя таго, будзе падрыхтавана шырокая дзелавая праграма. Але самае галоўнае, што хлопцы змогуць прадэманстраваць свае напрацоўкі і абмяняцца вопытам.

Дарэчы, падчас прамапраекта «Выбіраем студатрад!», які стартаваў у пачатку сакавіка і будзе доўжыцца да ліпеня ўключна, ужо запісаліся больш за 4,5 тысячы маладых людзей. Гэта тыя юнакі і дзяўчаты, якія выказалі жаданне папрацаваць у вольны ад вучобы час.

У ліку найлепшых

# ТУТ КОЖНАЯ МІС — ШТО КАРАЛЕВА!

**«Міс БДПУ-2021» стала студэнтка трэцяга курса факультэта дашкольнай адукацыі Валянціна Амбражэй. Пра гэта паведаміў у прэс-службе ВНУ.**

У актавай зале яе галоўнага корпуса прайшоў фінал конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс БДПУ». У ім бралі ўдзел 14 студэнтак вядучай педагагічнай ВНУ краіны.

Фінал уяўляў сабой тэатралізаванае шоу, падчас якога ўдзельніцы паказалі арыгінальныя вобразы ў розных стылях (беларускім, афіцыйна-дзелавым, спартыўным, вячэрнім), творчы нумар, прадэманстравалі свае інтэлектуальныя здольнасці. Ацэньвала творчы патэнцыял і артыстызм дзяўчат кампетэнтнае журы.



Фота з сайта БРСМ.

Па выніках конкурсу дзяўчаты былі ўдастоены ганаровых званняў: «Міс БДПУ-2021» — Валянціна Амбражэй, «Першая Віцэ-міс БДПУ-2021» — Карына Царкоўская, «Другая Віцэ-міс БДПУ-2021» — Ксенія Шэўчык, «Міс Дружба» — Лада Жук, «Міс глядацкіх сімпатый» — Марыя Буевіч, «Міс Талент» — Маргарыта Турлюк, «Міс Фота» — Аляксандра Рудовіч, «Міс Грацыя» — Вольга Жудро, «Міс Інтэлект» — Валянціна Амбражэй.

Заснавальнік конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства — рэктарат універсітэта. Арганізатары — студэнцкі савет сумесна з пярвічнай арганізацыяй БРСМ БДПУ пры падтрымцы Цэнтра студэнцкай творчасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЯК У 20 ГАДОЎ ПАСПЕЦЬ УСЁ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Алена для сябе абрала інжынерную спецыяльнасць.

— Вучоба вельмі падабаецца, яна шматпрофільная. Нам даюць веды з розных галін: будаўніцтва, машынабудаванне, дызайн... Вучаць прастораваму мысленню, думаць творча. Нягледзячы на тое што ў праграме шмат дысцыплін, упэўнена: усё гэта мне спатрэбіцца ў жыцці. Увогуле, я заўсёды ведала, што буду вучыцца ў БНТУ. Шмат маіх сваякоў прайшлі праз гэтую ВНУ.

Дзяўчына кажа, што планаванне часу ёй даецца лёгка. Але прызнаецца, што часам для таго, каб усё паспець, 24 гадзін у сутках не хапае.

— Паспяваць многае вымагае час, у якім мы жывём. Таксама трэба добра адпачываць для папаўнення рэсурсу жыццёвай энергіі. Усё, што мы робім цяпер, — гэта ўклад у будучыню. Люблю, калі ў рабоце ёсць



творчы падыход. Тады яна становіцца заняткам для душы. Вольнага часу ў мяне не вельмі многа, люблю праводзіць яго з сябрамі, таксама прысвячаю самаразвіццю. Напрыклад, зараз вывучаю вэб-мадэляванне, праграмы для распрацоўкі масак у Instagram. Таму можна сказаць, што ў мяне час праходзіць і з карысцю, і з адпачынкам.

У снежні 2020 года адбыліся адразу дзве запамінальныя для нашай суразмоўніцы падзеі. Яе імя было занесена на Дошку гонару Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Таксама танцавальная пара з удзелам Алены адкрыла Беларускі навагодні баль для моладзі ў Палацы Незалежнасці.

— Прыемна, што мае намаганні ацэнілі на такім высокім узроўні, — прызнаецца яна. — Думаю, гэта дзякуючы актыўнай рабоце ў БНТУ ў навуковай, сацыяльнай і культурнай сферах. Упэўнена: калі шмат працуеш, то рана ці позна цябе чакае поспех. Па-іншаму не бывае.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

***«Февраль на Драйве! Мастеркард»***

**1. Сведения об организаторе**

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

**2. Наименование Рекламной игры**

«Февраль на Драйве! Мастеркард»

**3. Срок начала и окончания Рекламной игры**

01 февраля 2021 г. – 14 апреля 2021 г.

**4. Сведения о государственной регистрации Рекламной игры**

Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве Антимонопольного Регулирования и Торговли Республики Беларусь 14 января 2021 года, свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3926.

**5. Сведения о количестве участников Рекламной игры**

В Рекламной игре приняло участие 39127 участников.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда**

Призовой фонд разыгран полностью.

**7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши)**

| Наименование Приза | Ф.И.О. Победителя |
|---|---|
| Автомобиль: Volkswagen Polo Respect MPI<br>Год выпуска: 2020<br>Цвет кузова: белый<br>стоимостью 31 071,00 белорусских рублей<br>и денежные средства в сумме 4 620,38 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | Истушкин<br>Виктор Леонидович |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры:** + 375 29 678 94 39.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»**
**(Продавец)**

**Лот № 1:** незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 500/U-65431, площадь (по данным тех. паспорта) – 5 218,6 кв. м, г. Минск, ул. Пономаренко, 7/12.

**Начальная цена с НДС** – 3187200,00 руб. **Задаток** – 318720,00 руб. **Земельный участок** 500000000006000098, 7,6447 га. Право постоянного пользования.

Аукцион состоится **27.04.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **23.04.2021 в 11.00**.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**• 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агат-электромеханический завод»**
**(Продавец)**

**Лот № 1 состав**: 1. Производственное помещение с инв. № 500/D-708129066, 19676,1 кв. м. 2. Механосборочный корпус № 2 с инв. № 500/D-708123186, 19368,9 кв. м. 3. Литейных цех с инв. № 500/C-43480, 2271 кв. м. 4. Здание многофункциональное с инв. № 500/C-46298, 198 кв. м. 5. Здание неустановленного назначения с инв. № 500/C-46297, 667,5 кв. м. 6. Административное помещение с инв. № 500/D-708180934, 1785,1 кв. м. 7. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель с инв. № 500/C-43877, 2294,4 кв. м. 8. Здание корпуса № 7, литер А 2/К, Б 1/К с инв. № 500/C-10022, 889 кв. м. 9. Здание административно-хозяйственное с инв. № 500/C-61454, 2833,6 кв. м. 10. Производственные помещения, складские помещения с инв. № 500/C-61461, 1040,9 кв. м. 11. Здание котельной с инв. № 500/C-61462, 2288,4 кв. м. 12. Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (корпус № 13) с инв. № 500/C-35699, 1261 кв. м. 13. Склад комплектации с инв. № 500/C-61458, 1822 кв. м. 14. Электрокарный участок с инв. № 500/C-61453, 656,5 кв. м. 15. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ с инв. № 500/C-46299, 67,1 кв. м. 16. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ с инв. № 500/C- 43878, 111 кв. м. 17. Склад с инв. № 500/C-61459, 222,6 кв. м. 18. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель с инв. № 500/C-43879, 67,2 кв. м. 19. Склад с инв. № 500/C-62879, 272,6 кв. м. 20. Центральный тепловой пункт с инв. № 500/C-62911, 100,4 кв. м. 21. 8058/10000 долей в капитальном строении 500/C-1029993 (хозяйственно-бытовая канализационная сеть), протяженность – 2103,21/2610,0 м. 22. 6777/10000 долей в капитальном строении 500/C-1029992 (ливневая канализационная сеть), протяженность – 1199,71/1770,3 м. 23. 6893/10000 долей в капитальном строении 500/C-1030001 (хозяйственно-питьевая водопроводная сеть), протяженность 2429,1/3524,1 м. 24. 7582/10000 долей в капитальном строении 500/C-1030003 (тепловая сеть), протяженность 1100,91/1452,0 м. Все объекты Лота № 1 расположены по адресам: г. Минск, ул. Волгоградская, 6, 8, 10. (Обременения по Лоту № 1, а также информация о земельных участках размещены на сайте Организатора аукциона ino.by).

**Начальная цена с НДС** – 11 794 535,99 долл. США.

**Задаток** – 1 557 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Аукцион состоится **30.04.2021** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **28.04.2021** в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

*Даніна пашаны*

# СЛОВА, СТРАШНЕЙШАЕ ЗА ГАРМАТУ

**25 студзеня 1943 года на партызанскім аэрадроме на Любаншчыне прызямліўся самалёт з Масквы. Калі з яго акуратна выгружалі чамаданы, партызаны пачалі гадаць, што за груз, і пачулі ў адказ жарт — «золата». «Мо, арудзія якая новая?» — выказаў меркаванне пажылы партызан. «Для немцаў гэта страшнейшае за гармату, дзядзька», — запэўнілі маскоўскія госці. Пазней стала вядома, што так былі дастаўлены друкарскі станок, шрыфты і папера.**



## НЕБЯСПЕЧНАЕ «ЗОЛАТА»

Рашэнне аб аднаўленні выпуску рэспубліканскіх газет «Звязда» і «Чырвоная змена» ў зоне партызанскіх злучэнняў ЦК кампартыі Беларусі прыняў у канцы 1942 года. Займацца выданнямі было даручана Міхаілу Барашкаву.

Да выпуску газет прыступілі неадкладна. 27 студзеня выйшаў нумар «Звязды», над якім працавалі суткі, а 31 студзеня — першы нумар «Чырвонкі»-партызанкі.

У склад рэдакцыі ўвайшлі вопытныя журналісты Філіп Касцюкавец і Георгій Шчарбатаў. Сярод партызанаў знайшліся і наборшчыкі: Ніна Цылько і Мікалай Курыка, таксама далучыўся да выдавецкай справы Амяльян Шурпач.

Два разы на тыдзень выходзіла «Звязда», адзін раз — «Чырвоная змена». Наборшчыкі суткамі не адыходзілі ад наборных кас. Шрыфту не хапала, таму яны набіралі спачатку адну паласу, друкавалі яе, потым разбіралі літары і браліся за другую. У студзені цямнее рана, таму работу працягвалі пры святле ад смалякоў, у рэдакцыі нават жартавалі, што ім патрэбны майстар па святле. Міхаіл Парфёнавіч вечарамі пісаў матэрыялы, вычытваў гранкі і сачыў за агнём...

Рэдактар не баяўся ніякай справы. Наадварот, больш цяжкія абавязкі браў на сябе, дэманструючы ўмельства і вынаходлівасць, удумліва працаваў над кожным словам. З Масквы ён прывёз падшыўку газеты «Правда» за 1942 год і часопіса «Крокодил». Падкрэсліваў, што па іх можна вучыцца, як пісаць коратка, даходліва, трапным словам біць заўсёды ў цэль. У Барашкава быў надзвва разборлівы почырк, і таму ўсе матэрыялы, якія ішлі ў набор, ён перапісваў уласнаручна. Да таго ж выконваў шматлікія даручэнні ЦК ЛКСМБ, бо быў членам бюро.

«Чырвонка» ўздымала моладзь на барацьбу, расказвала пра падзеі на франтах і аперацыі партызанаў, выкрывала зверствы акупантаў, папярэджвала аб згонах на прымусовыя работы, зрывала выкананне нямецкіх загадаў, паказвала колькасць пушчаных партызанамі пад адхон эшалонаў, вучыла падрыўной справе. Вялася барацьба і за хлеб, асобныя групы партызанаў дапамагалі сялянам ва ўборцы і захаванні ўраджаю. У рэдакцыю ішлі лісты і заметкі з розных куткоў Беларусі. Свае творы дасылалі паэты, у газетах-партызанках былі надрукаваныя вершы Пятра Глебкі, Аркадзя Куляшова, Анатоля Астрэйкі.

Нумары «Звязды» і «Чырвонай змены» дастаўляліся ва ўсе куткі Беларусі. Пасля таго як газеты перачытваліся ў партызанскіх атрадах, іх з рук у рукі перадавалі сяляне. У Слуцк нумары вазілі ў качанах капусты. Змяшчалі іх і ў пустых аглоблях. У Пінску газеты вывешвалі на дошцы загадаў у цэнтры горада, аднойчы нумар «Чырвонай змены» з папярэджаннем «Смерць фашысцкім акупантам!» падпольшчыкі паклалі на стол гебітскамісару.

## ВОСТРАЎ ДРУКУ

У партызанскую зону пачалі закідвацца шпіёны з заданнем высветліць месцазнаходжанне друкарні і знішчыць яе. Не раз яна мяняла размяшчэнне. Вясной 1943 года над партызанскай зонай кружылі варожыя самалёты, кідалі бомбы на вёскі, і падпольная друкарня вымушана была перабрацца на балота. Месца, дзе яна размясцілася, празвалі Востравам друку.

Сюды прыязджалі на вучобу рэдактары іншых партызанскіх газет. Барашкаў доўга гутарыў з кожным, а калі бачыў, што журналіст яшчэ нявопытны, стараўся растлумачыць, як наладзіць работу рэдакцыі, як і пра што пісаць.

Барашкаў ведаў пра справы ўсіх партызанскіх злучэнняў, бо прысутнічаў на пасяджэннях партызанскага абкама партыі, нарадах камандзіраў і камісараў, удзельнічаў у падрыхтоўцы і абмеркаванні найбуйнейшых партызанскіх аперацый, што дапамагала вызначаць напрамак для газеты, выбіраць галоўнае і асвятляць важныя пытанні. Міхаіл Парфёнавіч з вялікай ахвотай наведваў партызанскія атрады, гутарыў з мясцовымі жыхарамі, з дзіўнай лёгкасцю знаходзіў агульную мову з сялянамі. Летам 1943 года ў лісце да сваякоў Барашкаў пісаў: «Сеў пісаць пісьмо і ўспомніў, як хутка прайшло паўгода жыцця і работы ў тыле ворага. Час бяжыць вельмі хутка. Жыццё цудоўнае ў любую пару на сваёй роднай зямлі, тым больш калі ты прыносіш карысць Радзіме... Прыйдзе жаданы час, і мы будзем зноў будаваць новае жыццё пасля разгрому захопнікаў. Тое, што іх разграмім, у гэтым няма ніякага сумнення. Але асабліва наглядна відаць тут. Яны бяссільныя перамагчы наш народ, нашу краіну».

З павелічэннем фармату газет (з адной восьмай да адной чвэрці газетнага аркуша) колькасць работы падвоілася. Барашкаў пісаў за поўнач пры святле смалякa, бо трэба было, як развіднее, набіраць. Працавалі да поўнай знямогі, апантана. Калектыў падабраўся малады. Старэйшыя былі Міхаіл Барашкаў і Піліп Касцюкавец (па трыццаць з «хвосцікам»), астатнім у той час было па 17—19 гадоў. Наборшчыкам за касамі даводзілася горбіцца ад світання да змяркання. А вось друкавалі газеты і пры святле месяца. Выносілі рыштунак на палянку і чакалі, калі той падымецца над лесам. Начная работа ўскладнялася налётам камароў. У друкароў былі распухлыя ад пакусаў твары, рукі...

## АЎТАМАТ ЗАМЕСТ АЛОЎКА

З набліжэннем фронту фашысты ўзмацнілі карныя аперацыі. Работнікі рэдакцыі часта былі вымушаны адкладваць алоўкі, варштаты і брацца за аўтаматы, вінтоўкі, каб адбіваць варожыя атакі. Новы 1944 год сустрэлі ў трывозе. Фашысты былі ўжо за два кіламетры ад астраўка, дзе размяшчаліся рэдакцыі падпольных газет. Навагоднія нумары даставілі непасрэдна ў акопы, дзе партызаны трымалі абарону супраць ворага, які ў шмат разоў пераўзыходзіў іх колькасцю. Кола блакады звужалася, не хапала паперы. У экспедыцыю за ёй накіроўваліся спецыяльныя групы партызанаў. Па вёсках збіраліся сшыткі і шпалеры. Спрабавалі газеты друкаваць нават на бярэсце.

Урэшце са штаба злучэння прыйшоў загад падрыхтавацца да эвакуацыі. Каля вёскі Калінаўка давялося ўплаў фарсіраваць Арэсу, якая ў тую зіму не замярзала. Потым трое сутак партызаны выбіраліся з акружэння. Аселі ў вёсцы Камсамолец Старобінскага раёна. Пасля невялікага адпачынку ўзяліся за выпуск чарговых нумароў «Звязды» і «Чырвонай змены». У гэты час захварэў на тыф Міхаіл Барашкаў. Доктар казаў, што хваробу Барашкаў адолеў бы, калі б не рана ў грудзях, атрыманая яшчэ на фронце. Яна толькі крыху падгаілася. Аб раненні ў рэдакцыі ніхто не ведаў, пра яго Міхаіл Парфёнавіч ніколі не гаварыў, ніхто не чуў ад яго ні скаргаў, ні стогнаў. Цяжка хворы, ён цікавіўся газетай. А калі яму перадалі, што па распараджэнні ЦК ЛКСМБ «Чырвонка» аднаўляе свой выхад у Нова-Беліцы, на вызваленай зямлі, ён ледзь чутна сказаў: «Шчасліва табе, «Чырвонка». Гэта былі яго апошнія словы. На дзявятыя суткі хваробы рэдактара не стала. Яго пахавалі на ўскрайку вёскі Камсамолец (цяпер Салігорскі раён).


ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
Орган ЦК і Мінскага абкома Ленінскага Камсамола Беларусі
Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі
25 гадавіну ВЛКСМ адзначым новымі ўдарамі па ворагу
З аператыўных зводак Совінформбюро
(За тыдзень)

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*Цалкам матэрыял чытайце на сайце «Звязды».*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукциона: Голоцкий сельский исполнительный комитет,**
**Минский область, Пуховичский район, аг. Голоцк, ул. Центральная, 11, тел.: 8 (01713) 68589, 68636, 66899.**
**Дата проведения ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА: 28 апреля 2021 года в 15.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, руб | Задаток, руб. | Расходы по подготовке, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторово, ул. Яблоневая | 624482503101000479; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1308 | Сети электроснабжения газоснабжения | 9375,22 | 937,50 | 1724,00 + стоимость объявления в СМИ |
| 2 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторово, ул. Минская, уч. 3 | 624482503101000480; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1004 | Сети электроснабжения газоснабжения, водоснабжение | 7196,27 | 719,60 | 1687,60 + стоимость объявления в СМИ |
| 3 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторово, ул. Полевая, уч. 1 | 624482503101000478; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,0942 | Сети электроснабжения газоснабжения, водоснабжение | 6751,88 | 675,20 | 1497,84 + стоимость объявления в СМИ |
| 4 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Труд, ул. Дачная, уч. 1 | 624482505101000070; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1500 | Сети электроснабжения Газоснабжения | 6032,33 | 603,20 | 1628,00 + стоимость объявления в СМИ |

**Задаток для участия в открытом аукционе перечисляется** на расчетный счет № BY11AKBB36006250500040000000 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск код банка AKBBBY2X, МФО 153001795, УНП 600177877, ОКПО 04431027, код платежа 04901, Голоцкий сельский исполнительный комитет.

**Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в открытом аукционе. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в аукционе. **Окончание приема заявлений на участие в открытом аукционе** с прилагаемыми к ним документами – **22 апреля 2021 г. до 17.30.**

Лицо, желающее принять участие в открытом аукционе. В отношении нескольких земельных участков (далее – предметов торгов), вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник-пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Открытый аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведении аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель открытого аукциона обязан:

- возместить затраты на организацию и проведение открытого аукциона;
- возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем открытого аукциона указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. № 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку».

# ЖЫВУЦЬ У СЭРЦАХ СТУДАТРАДЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сумма членского взноса за 2019 г. 10,20 рублей.

**Телефон для справок**
**8017 322 04 44** **mgk-minsk.wixsite.com/mgk-minsk**

Первичная профсоюзная организация общества с ограниченной ответственностью «Эталон Комплект» прекращает деятельность в связи с реорганизацией организации.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, офис 13.

УНП 100799172

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 29.04.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Единый объект недвижимого имущества в составе:

1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 601/U-23461 общей площадью 574,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гостиница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047 площадью 2,0197 га.

2. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 601/U-23463 общей площадью 46,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1/1. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание контрольно-пропускного пункта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047 площадью 2,0197 га.

3. Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-23695, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения; наименование: артезианская скважина. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047 площадью 2,0197 га.

4. Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-23696, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: сооружение специализированное энергетики; наименование: трансформаторная подстанция. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047 площадью 2,0197 га.

**Начальная цена продажи – 163 296,00 бел. рублей, размер задатка – 16 329,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5051 общей площадью 519,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов; наименование: столярный цех и пилорама. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 18 432,00 бел. рублей, задаток – 1 843,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5054 общей площадью 243,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: бытовой корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 8 640,00 бел. рублей, задаток – 864,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5048 общей площадью 272,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов; наименование: цех ЖБИ № 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 9 720,00 бел. рублей, задаток – 972,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5050 общей площадью 388,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов; наименование: цех ЖБИ № 2. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 13 824,00 бел. рублей, задаток – 1 382,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5052 общей площадью 45,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: кузница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 1 656,00 бел. рублей, задаток – 165,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-5046 общей площадью 295,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад готовой продукции. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 10 512,00 бел. рублей, задаток – 1 051,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 452/С-7341, расположенное по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, г. п. Зельва, ул. Пушкина, д. 119. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: благоустройство территории (составные части и принадлежности: ограждение, ворота, асфальтное покрытие, бордюр дорожный, плиточное покрытие, бордюр тротуарный). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422655100000000060. **Начальная цена продажи – 18 576,00 бел. рублей, задаток – 1 857,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816293 общей площадью 13,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-145. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 2). **Начальная цена продажи – 16 560,00 бел. рублей, задаток – 1 656,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816294 общей площадью 14,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-151. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 8). **Начальная цена продажи – 16 920,00 бел. рублей, задаток – 1 692,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816292 общей площадью 14,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-141. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 20). **Начальная цена продажи – 16 830,00 бел. рублей, задаток – 1 683,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816291 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г.Минск, ул. Лукьяновича, 2В-140. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 21). **Начальная цена продажи – 17 010,00 бел. рублей, задаток – 1 701,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816290 общей площадью 15,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-136. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 25). **Начальная цена продажи – 17 820,00 бел. рублей, задаток – 1 782,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816285 общей площадью 14,3 кв. м, расположенное по адресу: г.Минск, ул. Лукьяновича, 2В-124. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 28). **Начальная цена продажи – 16 920,00 бел. рублей, задаток – 1 692,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816286 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-125. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 29). **Начальная цена продажи – 17 010,00 бел. рублей, задаток – 1 701,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816287 общей площадью 13,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-129. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 33). **Начальная цена продажи – 16 470,00 бел. рублей, задаток – 1 647,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816288 общей площадью 13,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-130. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 34). **Начальная цена продажи – 16 470,00 бел. рублей, задаток – 1 647,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816289 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-134. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 38). **Начальная цена продажи –17 730,00 бел. рублей, задаток – 1 773,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 29.04.2021 в 15.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 26.04.2021 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **29 апреля 2021 года.**

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63.**

SEX-БАЛЯСЫ

# НЕ ТАК ЗІРНУЛІ

**Нядаўна абаронцы прыроды раскрытыкавалі вядомую расійскую «інстаграм»-мадэль і інфлюэнсера Алесю Кафельнікаву, дачку вядомага тэнісіста Яўгена Кафельнікава, за яе фатаграфію ў голым выглядзе на спіне слана, якую яна зрабіла на Балі. («Вясна. У лес хочацца. Знайсці бярлогу і разбудзіць мядзведзя. А потым бегчы, бегчы ад яго, задыхаючыся ад захаплення».) Нягледзячы на тое, што многія з тых, хто падпісаны на яе ў «Інстаграме», напісалі нешта накшталт «У першы раз мне захацелася пабыць сланом», іншыя абурыліся выкарыстаннем жывёл для стварэння фатаграфій, якія абуджаюць жывёльныя інстынкты. («— Сямён Маркавіч, вы зусім пра мяне не думаеце! — Ды што вы, Роза Львоўна! Вы ў мяне з галавы нават пакурыць не выходзіце!») Пасля крытыкі Алеся папрасіла прабачэння за такое выкарыстанне слана і паведаміла, што яна зрабіла ахвяраванне для таго, каб палепшыць яго жыццё. Хто там хацеў пабыць сланом? («Не прымайце на свой рахунак нічога, апроч грошай».)**



Жыхары-мужчыны астравоў Балі ўвогуле любяць расійскіх турыстак, бо «зоркі» ходзяць тут практычна як маці нарадзіла. («— Што агульнага паміж балерынай і ваўком? — Іх ногі кормяць».) Нядаўна выключэннем не стала і спявачка Глюкоза, якая вылажыла ў «Інстаграме» здымак у вельмі адкрытым купальніку. («Насуперак законам аэрадынамікі, менавіта жанчыны з абцякальнымі формамі аказваюць найбольшае супраціўленне».) Настолькі адкрытым, што яго не адразу і заўважыш. («Мужчына ў аўтобусе вельмі ўважліва разглядае брошку ў выглядзе коніка на шыкоўным бюсце жанчыны. Яна не вытрымлівае: — Што, конік спадабаўся? — Не, іпадром».) Балі — адзіная месца ў краіне, дзе яшчэ захаваўся індуізм. Дзякуючы гэтай рэлігіі тут і існуе своеасаблівая свабода цела. Праўда, у адрозненне ад мужчын, мясцовыя жыхаркі не ў захапленні ад такіх паводзін турыстак. Кажуць, што да апошніх яны крыху раўнуюць, бо самі жывуць зусім па іншых законах. («Тата мыў посуд і яго засмактала ў зліўную адтуліну, ён усплыў у суседкі ў ванне, калі яна мылася. Прынамсі, ён так расказаў маці».)

Італьянскую спартыўную журналістку Дзілету Леоту літаральна «заклявалі» феміністкі. Што стала нагодай? Раз'юшыла дзяўчына бодзіпазітыўных дам тым, што з выклікам апранаецца, бо ў яе выдатная фігура. А якая яна павінна быць у спартыўнай журналісткі? («Прамы эфір высвечвае пад вострым вуглом праблему тупых людзей».) А апанентками, апроч таго самага бодзіпазітыву, і проціпаставіць няма чаго. («Здаровы спосаб жыцця — гэта павелічэнне працягласці жыцця за кошт змяншэння асалоды ад яго».) Кажуць, яшчэ крыху, і можа адрадзіцца старая еўрапейская традыцыя. («— Спаліць ведзьму, спаліць! — Вы што, не бачыце, якая гэта прыгожая жанчына? — Так... — Але потым усё роўна спаліць!»)

Бельгійскага журналіста і ранейшага прафесійнага велагоншчыка Свена Спаармейкерса таксама паспрабавалі абвінавачыць у фемінізме. Ён выклаў скрыншот у «Твітэры» з трансляцыі юнай аргенцінскай карэспандэнткі Белен дэ Мендзігурэн. («Я шчыры, але сарамлівы. Таму думаю людзям праўду ў твар».) Яна брала інтэрв'ю ў празрыстым топе, праз адзенне праступалі саскі. «У Аргенціне холадна?» — напісаў Свен. І панеслася... («Што павінен умець рабіць мужчына: 1. Не маўчаць, калі прыгатавана смачна. 2. Моўчкі жэрці, калі нясмачна...») Маўляў, чаго ты ўтаропіўся, яна ўсяго толькі надзела топ. Але мужчына здолеў адстаяць сваю пазіцыю. «Давайце не будзем прыплятаць фемінізм. Яна цудоўна ведала, што надзявае і навошта гэта робіць». Маўляў, думала, у вочы глядзець будуць?

Мадэль Кендал Джэнер знялася ў рэкламе брэнда бялізны Skims і спрабавала скандал у сецівe. Тым, што ў яе фігура проста шыкоўная, нікога не здзівіш. («Больш за ўсё ў ранішняй прабежцы мне падабаецца, што яе няма ў маім жыцці».) Але, як палічылі інтэрнэт-карыстальнікі, гэта ўжо занадта — ідэальная фота ў бікіні! («— У жанчыне павінна быць загадка. — Ты хочаш сказаць, што ў мяне няма загадак? — Адна загадка, разумееш, а не зборнік задач!») Мадэль западозрылі ў фоташопе. «Фоташопіць здымкі павінна быць незаконна» («Трэнер сказаў, што спорт дадасць мне некалькі гадоў жыцця, і гэта праўда. Зрабіла дзесяць прысяданняў і, па адчуваннях, мне 85».) Сама ж мадэль у спрэчкі ўступаць не стала, даслала адказ толькі адной дзяўчыне, якая перажывала з нагоды сваіх формаў. Яна напісала, што ёй «проста неверагодна пашчасціла, але кожнае цела па-свойму цудоўнае». («Шампунь «для аслабленых і пашкоджаных» наношу на ўсю сябе».)

Пацверджаннем гэтаму, мабыць, могуць стаць новыя «гарачыя» фота ў сподняй бялізне 32-гадовай амерыканскай поп-выканальніцы і прадпрымальніцы Рыяны, якая вельмі ганарыцца сваімі акруглымі формамі. («— Хачу, каб мужчыны насілі мяне на руках! — Хочаш быць штангай?») Яна зноў прыцягнула ўвагу фанатаў. Прыхільнікі засыпалі «зорку» кампліментамі: «Усім хейтэрам назло! Так іх, прыгажуня», «Такое цела грэх хаваць пад адзеннем!» Рыяна прасоўвае бодзіпазітыўны рух, выпусціла калекцыю бялізны для жанчын з нестандартнай знешнасцю. («Розачка з ранку змерала аб'ём клубаў і зразумела, што плацдарм для прыгод такі зноў павялічыўся».)

Так што многае залежыць ад таго, як на пытанне зірнуць. («У песіміста баба напалову так сабе, а ў аптыміста напалову нішто сабе такая».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ВАША ПАРФУМА — ГЭТА ЧАСТКА ВАС»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Наогул, працэс стварэння індывідуальнага водару досыць доўгі і асаблівы. Спачатку кліент выбірае, у якой форме мы з ім будзем супрацоўнічаць: ужывую або анлайн. Калі ён выбірае першы варыянт, тады мы сустракаемся ў мяне ў студыі, размаўляем мінімум паўгадзіны. За гэты час я не толькі даведваюся аб перавагах у водарах самога чалавека, але і аналізую яго. Мала хто ведае, але нават колер вашых валасоў, а тым больш ваш голас могуць падказаць парфумеру, які водар будзе ідэальны для вас. Пасля гэтага ствараю тры-пяць пробных асобнікаў і паказваю іх заказчыку. Праўда, часта бывае так, што даводзіцца дапрацоўваць іх, бо людзі не заўсёды ведаюць, чаго яны хочуць. Калі ж кліенты выбіраюць другі варыянт камунікацыі, то мы робім усё тое ж самае, толькі па відэасувязі.



Улад тлумачыць нам, што калі чалавеку падабаецца парфума з цытрусавым водарам, то дадаць у склад апельсін або цытрын і змяшаць са спіртам — «не пракацыць». У састаў водару можа ўваходзіць да некалькіх сотняў розных кампанентаў, але наш герой аддае перавагу ў рабоце прыкладна трыццаці, максімум — пяцідзесяці. Акрамя таго, суразмоўнік абвяргае яшчэ адзін міф пра састаў парфумы. Многія думаюць, што водары ствараюць з натуральных эфірных алеяў, але на самай справе кампанентаў расліннага і жывёльнага паходжання не так шмат. У прыродзе, напрыклад, няма азонавага эфірнага алею або алею бэзу, ландыша, малака. Большасць кампанентаў, якія выкарыстоўваюць парфумеры, — штучна сінтэзаваныя. Таксама яшчэ адным не менш рэдкім складнікам у водарах з'яўляюцца афрадызіякі. Некаторыя думаюць, што гэта проста маркетынгавы ход, але яны сапраўды існуюць і вельмі эфектыўныя. Напрыклад, мёд, цытрусы, спецыі, мідыі — усё гэта павышае лібіда.

**«Нават колер вашых валасоў, а тым больш ваш голас могуць падказаць парфумеру, які водар будзе ідэальны для вас».**

— Кліенты ў мяне бываюць самыя розныя, уласна, як і іх пажаданні. Многія могуць падумаць, што самы працяглы па часе выканання заказ я рабіў для якой-небудзь знакамітасці, але гэта не так. Адна жанчына, якая працавала на рынку, мела свой гандлёвы аб'ект з рыбай і вырашыла стварыць індывідуальны водар для сябе. Мне на гэта спатрэбілася сем месяцаў: ёй увесь час нешта не падабалася, больш смелыя пахі ёй здаваліся мужчынскімі, а больш простыя — «бабулінымі». У выніку ёй спадабаліся два зыходнікі, з якіх, дарэчы, яна таксама доўга не магла выбраць. Былі ў мяне і дзіўныя замовы. Адзін раз прасілі паўтарыць водар 1984 года. За гэты заказ я ўзяўся, але было вельмі няпроста спачатку знайсці рэцэптуру, затым я сутыкнуўся з тым, што некаторыя кампаненты ўжо даўно не выпускаюць. Але ў выніку заказчык застаўся вельмі задаволены.

Акрамя парфумы для дарослых, Улад стварае духі для дзяцей. Да гэтых кліентаў ён ставіцца з асаблівай увагай, бо адчувае адказнасць за іх здароўе. У складзе водараў для юных спажыўцоў Уладзіслаў выкарыстоўвае мінімальную колькасць спірту і розных алеяў, каб не нанесці шкоду скуры. А вось узроставым заказчыкам парфумер па-сапраўднаму захапляецца. Ён лічыць, што калі чалавек у шаноўным узросце разумее важнасць духоў, то гэта прыкмета адсутнасці інтэлектуальнага згасання.

— Усе мы разумеем, што стварэнне ўнікальнай парфумы — справа не з танных. Кошт залежыць ад некалькіх крытэрыяў, пачынаючы ад аб'ёму і заканчваючы колькасцю перароблених версій па жаданні заказчыка. Асноўны кошт вылічваецца, вядома, зыходзячы з саставу водару і флакона, у якім будуць знаходзіцца духі. Кошт многіх кампанентаў можа перавышаць цану ў пяцьдзясят еўра за грам, а ў слоічку, які мне трэба набыць, іх мінімум дзесяць. Флаконы таксама бываюць розныя. Самыя простыя — гэта шкляныя з мінімальным узорам. Пару разоў бывала такое, што кошт таго, у чым будзе захоўвацца водар, быў вышэйшы, чым ён сам. Я рабіў упакоўку ў выглядзе вялізнай мілай пчолкі, у якой замест вачэй было дзве парфумы — мужчынская і жаночая. А сама пчала была зроблена з дарагіх матэрыялаў і натуральнага футра. Гэта была замова мужчыны з Канады на вяселле дачкі. Адным з самых дарагіх заказаў была парфума ў флаконе ў выглядзе крыштальнага мікрафона для Мірэй Мацье, заказчыкам быў арганізатар яе гастроляў у Мінску.

Нягледзячы на ўсю ўнікальнасць прафесіі парфумера, яна мае адзін велізарны недахоп, калі выходзіш за парог рабочай прасторы. Гаворка ідзе аб выдатным нюху. У якасці прыкладу Улад прывёў нам гісторыю, як пайшоў аднойчы ў банк па асабістых справах і стаяў у чарзе за чалавекам, ад якога ішоў вельмі моцны спецыфічны пах. Пасля гэтага ён цэлы тыдзень правёў на бальнічным.

**Наш герой прызнаецца, што навучанне парфумернаму мастацтву — справа нялёгкая і не з танных.**

— Вывучыцца ў нашай краіне на парфумера, каб атрымаць дыплом, нерэальна. Ва ўсім свеце такіх устаноў настолькі мала, што іх можна пералічыць па пальцах, прычым для паступлення ўжо трэба мець хімічную адукацыю. Ёсць, вядома, спосаб ісці ў памочнікі да розных майстроў або на фабрыкі па вытворчасці парфумы. У мяне таксама ёсць курсы, дзе я навучаю людзей асновам парфумернага мастацтва. Акрамя таго, арганізоўваю адмысловыя майстар-класы на тэму «Як самастойна выбраць для сябе ідэальную парфуму». Сёння падзялюся з вамі некалькімі парадамі. Папершае, трэба вызначыць, які тып водару вам больш блізкі. Іх наогул вельмі шмат, асноўныя — гэта нішавыя, цытрусавыя і гэтак далей. Пасля таго як вы даведаліся, што прыкладна будзеце шукаць, ідзём у краму, пырскаем духі на пробнікі і выбіраем з усіх два-тры, што спадабаліся найбольш. Іх мы і наносім на ўчастку скуры. А потым — самае галоўнае: сыходзім з крамы з нанесенымі водарамі і да канца дня глядзім, наколькі яны падабаюцца, як раскрываюцца на целе. Галоўнае, памятайце, што ваша парфума — гэта частка вас саміх, і запомніць вас могуць менавіта па ёй. А якое меркаванне вы сфарміруеце ў навакольных людзей, залежыць ад таго, які водар нанесяце на сябе.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 24.03.2021 г.

# ТУРЫЗМ ЯК ПАШЫРЭННЕ МЕЖАЎ УЛАСНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ

**Краіна шукае новыя магчымасці для развіцця розных складнікаў эканомікі. І турыстычныя праекты займаюць у гэтым плане далёка не апошняе месца. Наша размова пра здабыткі і рэсурсы турыстычнай галіны — з дырэктарам Нацыянальнага агенцтва па турызме Паўлам САПОЦЬКАМ.**



Фота Яны ХВЕДЧЫНА.

***— Павел Міхайлавіч, Нацыянальнае агенцтва па турызме сваёй асноўнай мэтай ставіць пытанне садзейнічання развіццю турызму ў Рэспубліцы Беларусь і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы турызму і гасціннасці... Калі гэтыя мэты неяк працей раскрыць, чым усё ж такі займаецца згаданае агенцтва?***

— Спектр задач нашага агенцтва надзвычай шырокі: ажыццяўленне інфармацыйнай падтрымкі арганізацый сферы турызму, прасоўванне іх паслуг на ўнутраным і знешнім турыстычных рынках; арганізацыя і ўдзел у рабоце міжнародных турыстычных выставак у Беларусі і за яе межамі; умацаванне міжнародных сувязяў у сферы турызму, садзейнічанне развіццю міжнароднага і трансгранічнага турызму; навукова-метадычнае і вучэбна-аналітычнае забеспячэнне турыстычнай індустрыі, правядзенне маркетынгавых даследаванняў, садзейнічанне ў стварэнні новых канкурэнтаздольных турыстычных праграм; ажыццяўленне менеджменту якасці турыстычных паслуг, арганізацыя і правядзенне навучальных семінараў для экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, а таксама мерапрыемстваў для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

Таксама мы займаемся падрыхтоўкай, выданнем і распаўсюджваннем шматлікіх рэкламна-інфармацыйных матэрыялаў пра Беларусь, яе турыстычны патэнцыял, гісторыка-культурную спадчыну, прыродныя багацці (альбомаў, каталогаў, буклетаў, брашур, турыстычных карт, даведнікаў), стварэннем ролікаў пра турыстычныя магчымасці нашай краіны і яе рэгіёнаў; вядзём і актуалізуем Дзяржаўны кадастр турыстычных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны рэестр экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў Рэспублікі Беларусь. У нашай кампетэнцыі — правядзенне канферэнцый, круглых сталоў, выставак, конкурсаў з мэтай забеспячэння пастаяннага прафесійнага дыялогу спецыялістаў галіны, арганізацыя турыстычных праграм, скіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі і іншыя не менш важныя задачы.

***— Ці можна нейкім чынам спрагназаваць развіццё ўнутранага турызму, нягледзячы на найскладанейшую пандэмічную сітуацыю?***

— Безумоўна! У сувязі з эпідэміяй цэнтр цяжару пасунуўся на ўнутраны турызм, які і з'яўляецца магутным рэсурсам з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнага развіцця, і спрыяе адраджэнню рэгіёнаў, і асаблівую важнасць мае для грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

У Беларусі актыўна развіваецца культурна-пазнавальны, ваенна-гістарычны, сельскі, прамысловы, медыцынскі, гастранамічны турызм. У 2020 годзе распрацаваны новыя турыстычныя праграмы, абноўлены экскурсійныя маршруты, з'явіліся кластэры з цікавымі ідэямі. Кластэры аб'ядноўваюць гісторыка-культурныя і іншыя аб'екты адразу некалькіх рэгіёнаў краіны. У беларускіх аграсядзібах пашыраны пералік паслуг, з'явіліся новыя праграмы гістарычнай рэканструкцыі. Не застаюцца ўбаку музеі, якія актыўна ствараюць розныя мабільныя праграмы, сродкі віртуальнай і дадатковай рэальнасці, аўдыягіды і іншыя навінкі электроннага характару. Усё гэта, мы пераканаsuccessfully, стымулюе беларусаў ездзіць, глядзець, знаёміцца, атрымліваць асалоду ад уражанняў і... здзіўляцца!

***— А хіба беларусы, на ваш погляд, здольныя ўвогуле масава вывучаць сваю краіну? Ці нас больш усё ж такі цягне ў Егіпет і Турцыю?***

— Зразумела, турэцкі бераг і егіпецкія піраміды цягнуць да сябе! Але з вялікай зацікаўленасцю нашы суайчыннікі падарожнічаюць і па роднай краіне, адкрываючы для сябе нешта новае і цікавае. Бо турызм — гэта самы эфектыўны сродак СПАЗНАЦЬ БЕЛАРУСЬ, вывучыць гісторыю, захапіцца ўласнай нацыянальнай культурай. Дзеля гэтага ў нас ёсць літаральна ўсё: замкі і палацы, старадаўнія храмы розных канфесій, маляўнічыя прыродныя ландшафты, унікальныя нацыянальныя паркі і запаведнікі, яркія фестывалі і святы. У нас багатая нематэрыяльная спадчына, уражальная нацыянальная кухня і ўвогуле шмат што ёсць такога, да чаго хацелася б прыхінуцца. У кантэксце размовы прыгадваюцца словы іспанскага філосафа і пісьменніка Хасэ Артэга-і-Гасета: «Нікчэмнае тое жыццё, у якім не кіпіць вялікая прага да пашырэння сваіх межаў...» Але гэта дакладана не пра беларусаў, якія заўсёды вызначаліся патрэбай у пазнанні нечага новага.

***— Апошнія 10—15 гадоў болей акрэслена гавораць пра падвіды турыстычнага прадукту: пра прамысловы турызм, аздараўленчы турызм і г. д. Як складваюцца справы ў гэтых кірунках?***

— Работа ў гэтым рэчышчы ніколі не спынялася. Вельмі цікавыя праграмы прапануюць беларускія прамысловыя прадпрыемствы, сярод якіх — БелАЗ, МТЗ, кандытарская фабрыка «Камунарка» і іншыя лідары айчыннай прамысловасці. Многім даспадобы наведванні шклозавода «Нёман», фабрык «Слуцкія паясы» і «Белмастацкераміка», малочных заводаў і іншых прадпрыемстваў. Усё гэта суправаджаецца лекцыямі, сустрэчамі са спецыялістамі, аглядам прадукцыі, дэгустацыямі, майстар-класамі. У найбліжэйшы час агенцтва правядзе азнаямляльныя мерапрыемствы для экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў на некаторых прадпрыемствах канцэрна «Беллегпрам». Нядаўна правялі перагаворы з кіраўніцтвам Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», якая валодае ўнікальным фондам гульнявога рэквізіту, касцюма, піратэхнічных сродкаў. Для турыстаў будзе цікава працэс стварэння фільмаў як у павільёнах, так і на натурнай пляцоўцы. Пра медыцынскі турызм у свеце з кожным днём даведваецца ўсё больш людзей. Стаматалогія, трансплантацыя органаў і тканак, спелеалячэнне, камп'ютарная дыягностыка... Дзякуючы кваліфікаваным спецыялістам і сучасным медыцынскім цэнтрам у Беларусь едуць на лячэнне, а таксама для атрымання кансультацый медыкаў з самых розных краін. З мэтай аздараўлення ў беларускіх санаторыях нашу краіну наведвае ўсё большая колькасць замежнікаў. Канешне, усё пералічанае істотна ўмацоўвае імідж нашай дзяржавы.

***— У вас на сайце агенцтва пазначаны кадастр турыстычнага прадукту... Праўда, на вялікі жаль, я не змог адкрыць гэты рэсурс... А пытанне вось у чым — што ж сёння ўвогуле ўяўляе сабой гэты кадастр? Як класіфікуецца турыстычны прадукт?***

— Дадзены кадастр уяўляе сабой своеасаблівую базу даных розных турыстычных рэсурсаў, сярод якіх — помнікі гісторыі, археалогіі, архітэктуры, горадабудаўніцтва, помнікі прыроды, запаведныя мясціны і іншае. Вядзенне кадастру — вялікая інтэлектуальная праца спецыялістаў. У хуткім часе абноўлены і дапоўнены новы інфармацыйны кадастр будзе размешчаны на сайце агенцтва. Асобна мы вядзём базы аграсядзіб, атэляў, санаторна-курортных установ, музеяў... Хутка матэрыял, цікавы для турыстаў, будзе размешчаны на афіцыйным турыстычным партале Беларусі belarus.travel, які зараз праходзіць рэдызайн.

***— Магчымасці ўнутранага турызму — гэта, верагодна, і велізарны патэнцыял той шырокай музейнай дзейнасці, якую ажыццяўляюць у нашай краіне. Наколькі актыўна Нацыянальнае агенцтва садзейнічае прыцягненню музеяў у фарміраванне цэльнага турыстычнага патэнцыялу Беларусі?***

— Вы, вядома ж, зусім правільнае меркаванне выказваеце! Музей — найважнейшая частка ў ланцужку агульнай турыстычнай сістэмы. Мы плануем актыўна прыцягваць музеі як Мінска, так і рэгіёнаў у стварэнне новых турыстычных маршрутаў, а таксама аказваць магчымую інфармацыйную падтрымку. Сёння беларускія музеі валодаюць цікавымі пастаяннымі экспазіцыямі, арганізоўваюць часовыя выставачныя праекты, праводзяць праграмы гістарычнай рэканструкцыі, ствараюць інтэрактыўныя комплексы, прапаноўваюць розную сувенірную прадукцыю. Паход у музей — гэта паглыбленне ў гісторыю і знаёмства з багатай культурай беларусаў. Цікавасць уяўляюць новыя музеі — музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі — філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча — філіял Віцебскага цэнтра сучасных мастацтваў, музей Станіслава Манюшкі — філіял Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея, музей Хаіма Суціна ў гарадскім пасёлку Смілавічы.

Турыстам будзе цікава пазнаёміцца з новымі пастаяннымі экспазіцыямі, такімі як «Музей вайны — тэрыторыя міру» ў Мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць — герой», «Мінск. Верхні горад. Археалагічны музей» у Музеі гісторыі горада Мінска, «Беларускія яўрэі» ў Іў'еўскім музеі нацыянальных культур і іншыммі. Вялікую цікавасць выклікаюць таксама ведамасныя музеі, школьныя музеі.

***— Гістарычнае, літаратурнае, геаграфічнае і нават мастацкае краязнаўства — гэтыя галіны грамадскай, асветніцкай дзейнасці прыкметна заўважныя ў вырашэнні задач дзяржаўнай палітыкі ў галіне турызму?***

— Краязнаўцы — добрыя памагатыя і сябры любога арганізатара турыстычнай праграмы, бо яны валодаюць шырокімі ведамі па гісторыі і культуры пэўнага рэгіёна, ім больш блізкія дзіўныя факты, якія можна абыграць у рабоце экскурсавода і якімі можна здзівіць экскурсанта. Роўна год таму ў Мінску на базе Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь адбыўся I Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі, да арганізацыі якога самае непасрэднае дачыненне мелі і Міністэрства культуры, і Міністэрства інфармацыі. Форум раскрыў велізарны патэнцыял гэтага феномена — краязнаўства! Таму гістарычнае, літаратурнае, мастацкае краязнаўства можа лёгчы ў аснову новых цікавых і змястоўных экскурсійных маршрутаў па розных рэгіёнах Беларусі.

***— Як вы лічыце, а сёння, улічваючы многія складанасці пандэміі, ці мае сэнс пашырэнне інфармацыйных патокаў пра турыстычны патэнцыял Беларусі ў іншых краінах свету?***

— Гэта надзвычай важна! Адна з нашых задач — шырокае інфармацыйнае суправаджэнне сферы турызму: правядзенне прэс-тураў, арганізацыя спецыяльных праектаў са СМІ, падрыхтоўка спецвыпускаў друкаваных выданняў, запуск тэматычных рубрык у сацыяльных сетках, падрыхтоўкі цыкла праграм на тэлебачанні і іншае. У планах — стварэнне ролікаў пра турыстычныя магчымасці Беларусі, кожнай вобласці і Мінска з далейшым забеспячэннем шырокай іх трансляцыі на Беларускім тэлебачанні, на ўласных інфармацыйных рэсурсах, парталах арганізацый-партнёраў, сайтах арганізацый беларускай дыяспары ў розных краінах свету і іншым. Займаемся ўдасканаленнем сайта Нацыянальнага агенцтва па турызме, а яшчэ мадэрнізуем афіцыйны турыстычны партал Беларусі, удасканальваем яго тэхнічныя магчымасці, насычаем актуальным кантэнтам, які ўтрымлівае інфармацыю пра краіну, яе гісторыка-культурную і прыродную спадчыну, знакавыя падзеі, арганізацыі турызму, установы культуры, навіны...

***— Дзякуй, Павел Міхайлавіч, за такі грунтоўны расповед! Пажадаем вам высокага плёну ў турыстычнай рэпрэзентацыі Беларусі!***

**Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Пункт на карце

# ШЛЯХ ДА «ЕЛЬНІ»

**З лютага гэтага года ў Мёрскім раёне пачаліся работы па падаўжэнні экалагічнай сцежкі, якая вядзе да найбуйнейшага верхавога балота Беларусі — Ельні.**

Драўляны насціл на балоце працягласцю ў паўтара кіламетра з'явіўся на знакамітым балоце яшчэ ў 2014 годзе. Вось толькі пачынаўся ён не ад мяжы заказніка. У міжсезонне і даждлівае надвор'е дабрацца да яго (а гэта яшчэ каля кіламетра дарогі) было не так проста.

Падаўжэнне экалагічнай сцежкі «Азяраўкі–Ельня» дазволіць не толькі прывабіць у заказнік больш наведвальнікаў, але і зробіць шлях на балота больш даступным для маламабільнай групы людзей. На маршруце таксама ствараецца аздоблены прыпынак для адпачынку. Ужо ўстаноўленны драўляны навес.

Праклацці шлях да балота стала магчыма дзякуючы праекту міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Разам для грамады і прыроды: узмацненне працэсу развіцця ў Мёрскім раёне праз супрацоўніцтва мясцовай улады і грамадзянскай супольнасці», які рэалізуецца мясцовым райвыканкамам у партнёрстве з ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Латвійскім сельскім форумам.

У межах праекта таксама праводзіцца капітальны рамонт гарадской спартыўнай залы фізкультурна-спартыўнага клуба «Мёры». Гэты аб'ект важны ў першую чаргу для мясцовых жыхароў. Тут праходзяць заняткі для дзяцей і дарослых па футболе, валейболе і лёгкай атлетыцы, а таксама раённыя і абласныя спаборніцтвы. Плануецца, што спартыўная зала будзе здадзена ў эксплуатацыю да канца сакавіка.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Выигрывай с Onliner 17»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 17» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети интернет-сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**1. Организатор и Заинтересованное лицо Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – 613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

1.2. Заинтересованное лицо Рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «КИВИСМАРТБЕЛ», юридический адрес: 220025, г. Минск, пр-т Независимости, 177-20, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193210569, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 18.02.2019.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая рекламная игра называется «Выигрывай с Onliner 17».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры**

4.1. Рекламная игра проводится с 01.04.2021 по 31.05.2021 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования написания отзывов на интернет-ресурсе https://www.onliner.by о реализуемых интернет-магазинами товарах, рекламируемых в разделе сайта https://catalog.onliner.by.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

– Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

– Жуковец Илья Николаевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора по развитию;

– Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;

– Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;

– Бодиловский Артем Иванович, ООО «КИВИСМАРТБЕЛ», маркетолог.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

7.4. Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения требований, закрепленных в п. 8.1. – 8.3. настоящих Правил.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. зарегистрировать на интернет-ресурсе https://www.onliner.by учетную запись (профиль) на заявленных администрацией сайта условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора – https://www.onliner.by. При этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью до 30.04.2021 (включительно);

8.1.3. в период с 01.04.2021 по 30.04.2021 (включительно) оставить отзыв о любом товаре, размещенном в разделе сайта https://catalog.onliner.by. Исключение составляют товары со статусом «Товар снят с продажи».

8.2. Отзыв должен относиться к приобретенному товару; представлять собой рассказ, объемом не менее 10 (десяти) слов о потребительских свойствах и особенностях товара, личных впечатлениях от его использования; быть написан русским/белорусским литературным языком согласованными предложениями; соответствовать требованиям морали, не содержать ненормативной лексики, жаргона, оскорблений и т. п.; содержание отзыва не должно повторять содержание ранее опубликованных отзывов на сайте Организатора либо на иных сторонних интернет-ресурсах.

Организатор не несет ответственности за достоверность содержащихся в отзыве сведений. Комментарий о товаре является сугубо субъективным мнением автора отзыва.

8.3. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые выполнили приведенные в п. 8.1. – 8.2. условия, отзывы которых прошли успешную модерацию (проверку) со стороны Организатора и были опубликованы на сайте https://www.onliner.by в период с 01.04.2021 по 04.05.2021 (включительно). Пользователи, отзывы которых были отклонены Организатором по причине их несоответствия настоящим Правилам, к участию в Рекламной игре не допускаются.

8.4. При оставлении отзыва пользователь в течение 30 минут после его написания получит на адрес электронной почты, указанный при регистрации на сайте https://www.onliner.by, письмо, в котором будет содержаться информация об уникальном номере, присвоенном отзыву. Уникальный номер присваивается автоматически и соответствует дате и времени оставления пользователем отзыва на сайте Организатора. После проверки комментария на предмет его соответствия настоящим Правилам Организатор уведомит автора об опубликовании либо отклонении (удалении) отзыва посредством сообщения, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на сайте https://www.onliner.by в срок до 04.05.2021 (включительно).

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора, а также имущества Заинтересованного лица в размере **2136** (две тысячи сто тридцать шесть) белорусских рублей **81** (восемьдесят одна) копейка.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., белорусских рублей, с НДС | Всего стоимость, белорусских рублей, с НДС |
|---|---|---|---|---|
| Приз | **Телевизор Kivi43U710KB** | 3 | 639,17 | 1917,51 |
| | **Денежные средства в размере** | | 73,10 | 219,30 |
| | | | **Итого** | **2136,81** |

**10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призового фонда проводится 07.05.2021 в 12.00 в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Дзержинского, 5 – офис 613, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей Рекламной игры**

11.1. До момента проведения розыгрыша призов Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется в порядке возрастания по дате и времени оставления Участниками отзывов о товарах. Каждому такому отзыву в Списке присваивается свой итоговый порядковый номер, который является участвующим в розыгрыше Игровым кодом. Нумерация Игровых кодов начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код Участника; уникальный номер отзыва; дату и время оставления отзыва; дату и время опубликования отзыва; дату и время, когда пользователь подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет очередную цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3. – 11.5. настоящих Правил, и каждый 500-й (пятисотый), следующий за ним в Списке, в количестве 2 (двух) Игровых кодов. Всего 3 (три) приза.

В случае если выигрышный Игровой код Участника попадает на конец Списка, дальнейшее исчисление Игровых кодов для определения победителей Рекламной игры продолжается с начала Списка.

11.7. Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор до 14.05.2021 (включительно) уведомляет победителей письмом, высланным по адресу электронной почты, указанному Участником при регистрации профиля на сайте https://www.onliner.by, и путем направления соответствующего уведомления, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на интернет-ресурсе Организатора. Организатор также вправе дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза победители должны явиться не позднее 31.05.2021 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона: + 375 29 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 29.05.2021 с 10.00 до 13.00. При получении приза победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. Победитель лишается права на получение приза в случаях: не указания либо указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; непредоставления Организатору сведений и документа, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза; неявки за получением приза в определенный в п. 13.1. срок. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении победителям имущества «Приз» обязан удержать у последних причитающиеся им денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателей указанных призов.

13.5. Расходы, связанные с проездом победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 20.05.2021 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона: + 375 29 514-35-24. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в рекламной Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в любых рекламных и/или иных информационных материалах, связанных с Рекламной игрой, права на которые принадлежат Организатору.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в рекламной Игре, отказать в выдаче Приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за полноту и достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу организаций, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовых электронных сервисов (сроки доставки электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, а также посредством электронной почты: game17@onliner.by.

*Свидетельство № 3954 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 17 марта 2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

## Узденский райисполком 28 апреля 2021 г. в 11.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, (кабинет № 213) проводит открытый аукцион (Лот № 1) и повторный открытый аукцион (Лот № 2) (далее – аукцион) по продаже нижеперечисленных в таблице не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов и предоставлении их победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | Кадастровый номер, S (га) | Начальная цена, бел. руб. | Недвижимое имущество (не завершенное строительством, незаконсервированное строение) | Расходы по подготовке, бел. руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Магдалены Радзивилл, уч. 10 | 625650100003001584 0,0816 га | 11 965,28 | Фундамент, подведен газ | 238,90 и расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Первомайская, уч. 128 | 625650100001000490 0,1500 га | 20 931,00 | Фундамент (блоки ФБС) | 306,21 и расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Аукцион будет проводиться в порядке, установленном пунктами 20–33 Положения о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

Начальная цена предмета аукциона (лот № 1) – 11 965, 28 белорусского рубля, в том числе:

начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 4 965, 28 белорусского рубля;

начальная цена продажи земельного участка – 7 000,00 белорусского рубля;

затраты на организацию и проведение аукциона составляют 238,90 белорусского рубля.

Начальная цена предмета повторного аукциона (лот № 2) – 20 931,00 белорусского рубля, в том числе:

начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 5 931,00 белорусского рубля;

начальная цена продажи земельного участка – 15 000,00 белорусского рубля;

затраты на организацию и проведение аукциона составляют – 306,21 белорусского рубля.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона перечисляется в срок, **не позднее 26 апреля 2021 г.** платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 4707, назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении двух лотов, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих лотов.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет № 407 заместителем начальника отдела жилищно-коммунального хозяйства, архитектуры и строительства Узденского райисполкома с 08.30 по 17.00 в рабочие дни. Окончательный срок приема заявлений с необходимыми документами 26 апреля 2021 г. с 08.30 по 17.00.

Участники аукциона, которыми могут быть граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подают следующие документы:

- заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона;

- документ о внесении суммы задатка с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию по проведению аукциона или Узденский райисполком по вышеуказанному адресу участниками аукциона представляются:

- гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

- представителем гражданина – доверенность оформленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Заключительная регистрация участников аукциона – с 09.00 до 10.25 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Порядок осмотра на местности предмета аукциона осуществляется путем самостоятельного выезда желающими принять участие в аукционе к месту нахождения объектов.

Контактные телефоны председателя и секретаря комиссии: 8 (01718) 65-4-75, 51-6-70; моб. 8 (033) 604-49-71.

Юрый ШАЎЦОЎ:

# «У мяне ніколі не ўзнікала жадання кінуць спорт»

Пра што думае галоўны трэнер мужчынскай зборнай Беларусі па гандболе

**Спартсмены — людзі з моцным не толькі целам, але і духам. Спорт вучыць думаць на тры крокі наперад, аналізаваць сітуацыю і прымаць правільныя рашэнні. Таму ў атлетаў ёсць чаму павучыцца, да іх думак варта прыслухоўвацца. У рубрыцы «Моцныя думкі» мы прапануем даведацца, пра што думаюць спартсмены.**

Звычайна такія інтэрв'ю робяцца з нагоды юбілеяў. Але думкі знакамітых, аўтарытэтных людзей цікавыя і карысныя ў любы час. Юрый Шаўцоў — менавіта такі чалавек, які ўсё жыццё прысвяціў сваёй справе — гандболу. Імя алімпійскага чэмпіёна 1988 года непарыўна звязана з гісторыяй непераможнага мінскага СКА, дзе ён раскрыўся як выдатны гандбаліст. Вучань легендарнага Спартака Міранавіча пасля заканчэння спартыўнай кар'еры таксама пачаў трэніраваць. І даказаў, што выдатны спартсмен можа стаць высакакласным трэнерам. Сваю трэнерскую кар'еру Шаўцоў пачынаў з нямецкага клуба «Блаў-Вайс-Шпандаў», за які сам калісьці выступаў два сезоны. З 2009 года Юрый Шаўцоў узначальвае нацыянальную мужчынскую зборную. Дзякуючы яму каманда неаднаразова прабівалася ў фінальныя стадыі чэмпіянатаў Еўропы і свету, была ў кроку ад алімпійскай ліцэнзіі.

**«У вагоне было шмат людзей і не было ніводнага чалавека без тэлефона ў руках. Мне стала так цікава: што ж там можна рабіць?»**

З нагоды нядаўніх чэмпіянату свету па гандболе і адборачных матчаў да чэмпіянату Еўропы-2022 Юрый Шаўцоў зноў у цэнтры ўвагі.

## «Я ніколі не быў талентам — усяго дасягнуў працай»

**Няўдалая музыкальная кар'ера.** У дзяцінстве я год займаўся ў музычнай школе па класе акардэона. Гэта была ідэя маіх бацькоў, яны хацелі даць мне класічную адукацыю, якая прадугледжвала ігру на музычным інструменце. Але мой музычны слых не тое што на нулі, ён у мінусе. І калі бацькам пазванілі з музычнай школы з пытаннем, чаму я не прыходжу на заняткі, яны зразумелі, што гэта не маё. Але «маё» мяне знайшло: сябар запрасіў у секцыю гандбола, і я там застаўся.

**Шчаслівы выпадак і праца.** У маім жыцці было шмат спартыўнага шчасця. Мой бацька займаў высокую пасаду і яго часта пераводзілі ў розныя гарады. Я пачаў займацца гандболам у Чавусах, але праз перавод бацькі наша сям'я пераехала ў Слуцк. І мой трэнер прыехаў у Слуцк угаварваць бацькоў адпусціць мяне ў інтэрнат, каб я мог займацца гандболам. Мама не хацела мяне адпускаць, але тата прыняў валявое рашэнне і пагадзіўся. Гэта быў шчаслівы выпадак. Магчыма, калі б бацька сказаў «не», у мяне б не склалася такая кар'ера. Ды яшчэ мой першы трэнер Уладзімір Шагунін зрабіў такі крок. Не ведаю, чаму ён так паступіў, што ён ува мне ўбачыў. Калі б я ацэньваў сябе ў той час, то трэнер Шаўцоў гульца Шаўцова нікуды б не ўзяў.

**«Мы былі цвёрда ўпэўненыя ў сваіх сілах. І ніколі не было каманды, у якой ніяк не ўдавалася выйграць. Усё гэта было напрацавана потам і крывёю».**


Фота Беларускай федэрацыі гандбола.

Я ніколі не быў талентам. Усё, чаго я дасягнуў, стала магчыма дзякуючы працы. Мне пашанцавала, што маім трэнерам быў Спартак Міранавіч. Мне пашанцавала сустрэць патрэбных людзей, якія, у адрозненне ад мяне самога, ува мне штосьці бачылі. І працуючы з такімі людзьмі, выдатнымі спецыялістамі, мне ўдалося зрабіць кар'еру і трапіць у нацыянальную зборную СССР, куды было вельмі цяжка ўвайсці. Нас было па чатыры, а то і па пяць чалавек на месца, два маіх сапернікі былі алімпійскія чэмпіёны. Без цяжкай працы ўвайсці ў нацыянальную савецкую зборную і там сябе праявіць было немагчыма.

**Эфектыўная сістэма.** Калі я прыйшоў у мінскі СКА, вялікі трэнер Спартак Міранавіч прыдумаў новую сістэму. Пачаліся цяжкія трэніроўкі па тры разы на дзень, Спартак Пятровіч хацеў праводзіць па чатыры трэніроўкі. І ў нашу каманду, якая працавала ў такім рэжыме, не хацелі прыходзіць гульцы. Але гэта прынесла поспех — значыць, такая методыка была правільная. Калі б я цяпер даў камандзе такія трэніроўкі, яны, мякка кажучы, мяне не зразумелі б. Цяпер не толькі ў спорце, але і ва ўсім свеце назіраецца тэндэнцыя да таго, каб рабіць усё, што рабілі раней, прыкладаючы менш намаганняў. Свет развіваецца, удасканальваюцца тэхналогіі і методыкі, усё ідзе наперад.

## «А вы хутчэй бегаць не можаце?»

**Беларуская і нямецкая гандбольныя школы.** У савецкі час, дзякуючы вялікім аб'ёмам работы, інтэнсіўным трэніроўкам, магчымасці трэніравацца два ці тры разы на дзень, наш гандбол быў вышэйшы па тэхніцы, па сіле. І калі мы выязджалі на спаборніцтвы, нас баяліся. Але я не памятаю выпадкаў, каб мы баяліся сваіх сапернікаў. Мы іх паважалі, аднак былі цвёрда ўпэўненыя ў сваіх сілах. І ніколі не было каманды, у якой ніяк не ўдавалася выйграць. Усё гэта было напрацавана потам і крывёю.

З цягам часу з'явіліся новыя методыкі і тэхналогіі, якія актыўна прымяняюцца на Захадзе. Але яны арыентуюцца менавіта на нашу сістэму трэніровак, выкарыстоўваючы яе ў лягчэйшай форме з іншымі падыходамі. Такім чынам яны затрачваюць менш сіл і энергіі. І так мы памяняліся месцамі. Сёння заходнія каманды — законадаўцы мод, а мы іх даганяем, таму што патэнцыял методык і навацый у іх значна вышэйшы, чым у нас. Калі я працаваў у Бундэслізе ў Германіі, толькі ў адной камандзе трэнерскі штаб складаўся з дзесяці чалавек. І там пастаянна трэба было прымяняць штосьці новае.

**Гандбол тады і цяпер.** Неяк на зборы я ўключыў гульню з маім удзелам. Я даўно не бачыў, каб мая каманда так смяялася. Ва ўсіх было адно пытанне — «А вы хутчэй бегаць не можаце?» А мы тады былі самай хуткай камандай, цяпер так бегаюць усе. Вырaслі хуткасці, гульцы сталі больш магутныя. У спорце, як і ва ўсім свеце, усё ідзе наперад і мяняецца. Сучасны гандбол больш хуткі і моцны, чым быў раней.

**Найлепшыя гандбалісты.** Добрыя гульцы былі заўсёды, у любы час. Таму мне цяжка кагосьці асабіста вылучыць. Магу назваць аднаго гульца, у якога не склалася звышнатуральная кар'ера, але гэта быў выдатны гандбаліст, — Уладзімір Бялоў.

## «Я ўсё ведаю наперад»

**Трэнер — адзіночка.** Часта кажуць, што «трэнер разам з камандай». Але насамрэч гэта няпраўда, трэнер заўсёды адзін. У пройгрышы вінаваты трэнер. А чаму не каманда? Але пры перамозе трэнер разам з камандай. Таму я лічу, што трэнер — гэта адзіночка. Ён працуе самастойна, але ў яго ёсць каманда. І трэнер, які добра выконвае сваю работу, дае гульцу ўсё, што ведае і ўмее сам. Для таго каб у члена каманды ўсё атрымлівалася, ён павінен верыць трэнеру. Тады атрымліваецца добрая сумесная работа, гэта прадэманстравана і даказана практыкай. А потым гульцы сыходзяць, трэнер набірае новых і працягвае працаваць далей.

**Канфлікты.** Я так даўно на трэнерскай рабоце і столькі прайшоў, што для мяне тут больш не існуе сюрпрызаў ці сакрэтаў. І калі ў камандзе здараюцца канфлікты, я ведаю, як яны будуць развівацца. Бо яны часцей за ўсё паўтараюцца з рознымі ўдзельнікамі. А канфлікты паміж трэнерам і камандай ёсць заўсёды, часам яны выходзяць за межы рабочага працэсу, часам — не. Але ў любога трэнера, у любой камандзе ёсць канфлікты. У мяне часта пытаюцца, як мне ўдаецца працаваць, не павышаючы голас на спартсменаў. А я не ведаю, што на гэта адказаць. Не раблю нічога звышнатуральнага, не раблю ніякіх намаганняў над сабой. Мабыць, у мяне проста такі характар.

**«Я ўжо прафесіянал у сваёй справе і больш нічога не ўмею. Ніколі не хаваў, што спорт — маё прызванне, і мне пашчасціла яго знайсці».**

**Моладзь.** У нас расце добрая моладзь. Кожны жыве ў свой час, у сваю эпоху, і ў кожнага часу свая генерацыя. У мой час мы не мелі столькі магчымасцяў, якія ёсць цяпер. У нас былі свае інтарэсы, захапленні. У сучаснай моладзі — іншае жыццё. Я лічу, некарэктна казаць, што ў нас «не тая моладзь». Яна добрая, проста да кожнага пакалення трэба знайсці свой падыход.

## «Я хацеў бы, каб унукі былі спартсменамі»

**Крытыка і хэйт.** Стаўлюся да крытыкі як да адной з частак маёй работы. Я прыходжу на трэніроўку — я працую. Мяне крытыкуюць — ну, гэта мая работа. Да форумаў, дзе так шмат крытыкаў, увогуле стаўлюся спецыфічна. Я вырас у СССР, і тады гэта называлася «ананімкай». Цяпер людзі падпісваюцца псеўданімамі і могуць пісаць што заўгодна, абражаць. Я гэта бачу як новую форму «ананімкі». Я за тое, каб людзі выступалі адкрыта, не хавалі свайго прозвішча. Таму форумы не чытаю, для мяне гэта табу.

**Аўтарытэт.** Не магу сказаць, што ў мяне ёсць аўтарытэт. Няма ідэальных людзей. Няма людзей, якія жывуць без памылак, іх робяць усе. І з вопыту жыцця ведаю, што варта прыслухоўвацца да ўсіх (калі гэта не форум, вядома). А потым адбіраць, што патрэбна, а што — не.

**Эмацыянальнае выгаранне.** У мяне ніколі не было думкі цалкам кінуць спорт. У сваёй сям'і я адзін маю дачыненне да спорту. І не ведаю, чым бы яшчэ мог займацца. Ды я ўжо прафесіянал у сваёй справе і больш нічога не ўмею. Ніколі не хаваў, што спорт — маё прызванне, і мне пашчасціла яго знайсці.

**«Мой трэнер прыехаў у Слуцк угаворваць бацькоў адпусціць мяне ў інтэрнат, каб я мог займацца гандболам. Мама не хацела мяне адпускаць, але тата прыняў валявое рашэнне».**

**Акрамя гандбола.** Трэнерская работа — вельмі напружаная, таму трэба неяк адпачываць. Пакуль дазваляла здароўе, я бегаў. Цяпер катаюся на веласіпедзе, магу праехаць 40—50 кіламетраў. Сачу за тым, што адбываецца ў спорце. Спаборніцтвы, дасягненні, навацыі — мне ўсё цікава.

**Кнігі.** Я чытаю шмат спартыўнай літаратуры, кнігі знакамітых спартсменаў, кнігі па псіхалогіі. Такая літаратура падыдзе не кожнаму. Увогуле, мне здаецца, што апошнім часам людзі мала чытаюць, усе жывуць у інтэрнэце. Памятаю, у Азіі ехаў у метро. У вагоне было шмат людзей і не было ніводнага чалавека без тэлефона ў руках. Мне стала так цікава: што ж там можна рабіць? Я зазірнуў і ўбачыў, што некаторыя нават фільмы глядзяць. Мне гэта незразумела.

**Сям'я.** У мяне два ўнукі і тры ўнучкі, я іх вельмі люблю, і мне вельмі цікава, якімі людзьмі яны вырастуць. Самы малодшы ўнук (яму паўтара года), як толькі прыходжу да яго ў госці, бярэ ў рукі мяч і гуляе з ім, кідае. І калі быў нядаўні чэмпіянат свету ў Егіпце, з пачаткам гульні ён хапаў мяч і бег з ім да тэлевізара. Пакуль ён адзіны праяўляе такую цікавасць да спорту. Магчыма, гэтае дзіцячае захапленне перарасце ў нешта больш сур'ёзнае. Дзяўчаткі дакладна спортам займацца не будуць. Асабіста мне хацелася б, каб мае ўнукі сталі спартсменамі. Але ж гэта іх жыццё, і яны будуць самі выбіраць, чым займацца.

**Матывацыя.** Алімпійскія чэмпіёны — ненармальныя людзі. І толькі яны могуць зразумець і адчуць свае адрозненні ад звычайных людзей. Я ведаю, колькі працы стаіць за кожнай перамогай, за кожным дасягненнем. У мяне былі гульні, калі выйгравалі на апошніх секундах, ці, наадварот, прайгравалі ў апошнія імгненні. І калі дасягаеш таго, да чаго ідзеш, утвараецца пустэча. На наступны дзень прачынаешся і думаеш: «А што далей?» Але выпіваеш філіжанку кавы, і жыццё ідзе па-новаму, вымалёўваюцца новыя мэты, вяршыні, дасягненні. Прыходзіш і да іх. І зноў прачынаешся, выпіваеш кавы...

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Нефармат

# НЯПРОСТЫЯ СОРАК ПАСЛЯ САРАКА



Неяк пісьменніца Вікторыя Токарава ва ўласцівай ёй іранічнай манеры параіла 40-гадовым паням не вохкаць прывычна на тэму «бабін век — 40 гадоў», а мець на ўвазе, што пасля сарака трэба жыць яшчэ сорак. Лепей падумаць, як гэтыя другія «сорак» пражыць з улікам памылак першых. Згадалася тое даўняе інтэрв'ю, калі слухала адну радыёперадачу.

Позна вечарам выхаднога дня, бывае, натыкаюся на хвалю праграмы, дзе гучаць старыя песні, а таксама гісторыі аўтараў пісем. Вось зачытваюць ліст слухачкі, паводле якога, у далёкім, ну скажам, 1965-м, яна сустрэлася з хлопцам. Іскрынку кахання, што быццам бы прамільгнула, ці то не распазналі, ці не змаглі захаваць. Былі кароткія сустрэчы, спатканні, потым жыццё з нейкіх прычын развяло ў розныя бакі. Але ўсе гэтыя гады аўтарка пісьма захоўвала памяць пра сустрэчу. А вось цяпер муж памёр, дзеці выраслі, і яна хацела б сустрэцца альбо хоць бы спісацца з тым, хто служыў напамінам пра маладосць усё жыццё. Пры гэтым называецца прозвішча, імя, імя па бацьку рэальнага чалавека.

Здавалася б, нічога асаблівага. Але такія, няхай сабе і нявінныя, прызнанні могуць стаць праблемай у сям'і былога знаёмага, калі ў яго, скажам, крыху раўнівая альбо сварлівая жонка. А калі не крыху? Вядома, можна зразумець імкненне жанчыны знайсці тое, да чаго хочацца прыхінуцца душой, асабліва калі спасцігла адзінота. Нават далёкі тэлефонны суразмоўнік можа стаць астраўком у пустыні. Калі быць шчырымі, то хто не носіць маленькіх таямніц у куточках сэрца? Але ж нездарма кажуць, што не ўвойдзеш у адну і тую ж рэчку двойчы.

Больш за дваццаць гадоў таму на мой рэдакцыйны стол трапіў ліст з Кіева. Вельмі кароткае і вельмі незвычайнае. Супрацоўніца навукова-даследчай установы, выпускніца філасофскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта прасіла адшукаць чалавека, які, паводле яе звестак, працуе ў адной з брэсцкіх ВНУ, і сказаць яму, што дваццаць гадоў таму яна зрабіла памылку, яна не мела рацыі. Абзваніўшы аддзелы кадраў абодвух універсітэтаў, я даведалася, што названы чалавек у іх ніколі не працаваў. Можна было спакойна спісваць ліст у архіў, але нейкі адчай, нейкі крык душы, якімі патыхала з пісьма, не далі гэтага зрабіць. Пісьмо ляжала ў папцы, можа, з месяц, а потым я прыдумала адну рэч. З чарговай падборкай пісьмаў падрыхтавала маленькі зварот да таго самага чалавека, каб ён прыйшоў і забраў ліст з Кіева, калі прачытае газету. І недзе праз тыдзень у кабінет сапраўды зайшоў мужчына і назваў сваё прозвішча. Аказалася, выпускнік прэстыжнай маскоўскай ВНУ расчараваўся ў прафесіі і прыехаў у Кобрынскі раён, на малую радзіму, каб заняцца сельскай гаспадаркай. Жыў адзін. Я ўзрадавалася — не перадаць вам, як. Проста прадчувала рамантычную гісторыю са шчаслівым фіналам.

...А ён узяў ліст, прачытаў яго, і твар, а затым уся постаць ператварыліся ў суцэльнае здзіўленне: «Ну і ну! І адносіны ж у нас былі чыста тэарэтычныя», — адзінае, што ён сказаў і зачыніў за сабою дзверы. У мяне было адчуванне, што гэты тэарэтык «пракінуў» мяне. Тады.

Цяпер думаю, што наўрад ці варта вінаваціць чалавека за тое, у чым няма яго віны. Гады, тым больш дзесяцігоддзі, многае мяняюць у жыцці. Адночы мне расказала сваю гісторыю сталая жанчына, з якой мы раней працавалі ў адной газеце. У яе склалася, як, відаць, у многіх. Каханню маладосці не суджана было спраўдзіцца. І жылі яны ў адным горадзе кожны сваёй сям'ёй. У Марыі Мікалаеўны рана памёр муж, але яна, як сказала, глядзець у бок таго баялася. А потым здарылася так, што і ён стаў удаўцом. Праз некаторы час сустрэліся, але зразумелі, што чужыя, што нічога не вернеш. У кожнага свае дзеці, унукі, свой прывычны ўклад жыцця, свой погляд на жыццё. І прызналася мая суразмоўніца, што адчула вялікае расчараванне. Рамантычны герой з маладосці, якога сама ж стварыла і ўзгадавала ў сваёй душы, не супаў з рэальным чалавекам. Лепш бы заставалася ўсё, як было — зрабіла выснову жанчына.

Яно, вядома, бывае і наадварот, калі людзі сустракаюцца, выпраўляюць памылкі маладосці, як у адной з песень Алы Пугачовай: «Я опоздала встретить с тобой рассвет, / Может, успею встретить с тобою закат». Дый хораша ў песні, а ў жыцці часцей калі ўжо не паспееш, то і спазнішся. І ніколі не ведаеш, ці варта шукаць адночы страчанае. Можа, лепш засяроджвацца на новых сябрах, знаёмых, уражаннях, занятках, як гэта зрабіла адна жанчына з выхадам на пенсію. Яна памяняла месца жыхарства, спосаб жыцця, род заняткаў. І зусім не шкадуе. Лічыць, што атрымала больш, чым страціла. Але пра яе пастараюся расказаць наступным разам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.59 | 19.33 | 12.34 |
| Віцебск — | 6.48 | 19.23 | 12.35 |
| Магілёў — | 6.50 | 19.23 | 12.33 |
| Гомель — | 6.47 | 19.19 | 12.32 |
| Гродна — | 7.15 | 19.48 | 12.33 |
| Брэст — | 7.16 | 19.48 | 12.32 |

### Месяц

*Першая квадра 21 сакавіка. Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр. Епіфана, Івана, Рыгора, Сямёна, Уладзіміра, Феафана. К. ДАБРАВЕШЧАННЕ. Марыі, Пракопа.*



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**25 САКАВІКА**

У краіне

**1931** год — нарадзілася Раўміра Сяргееўна Піёнава, беларускі вучоны ў галіне педагогікі, доктар педагагічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, выхавання і развіцця грамадскай актыўнасці моладзі, навукова-прафесійнай падрыхтоўкі магістраў і аспірантаў.



**1931** год — нарадзіўся Віктар Сямёнавіч Бураkоў, вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі. Аўтар больш за 300 навуковых прац, 11 вынаходніцтваў і патэнтаў. Праводзіў даследаванні па квантавай электроніцы і спектраскапіі плазмы. Навукоўцам ажыццёўлена распрацоўка новых метадаў спектральнага аналізу і іх укараненне на прадпрыемствах рэспублікі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974) за навуковыя дасягненні ў галіне фізікі.

**1966** год — у Брэсце адкрыты інжынерна-будаўнічы інстытут.

У свеце

**1751** год — нарадзіўся Гангаа П'етродзі Гатарда, італьянскі мастак тэатра, найбуйнейшы майстар тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя.

**1881** год — нарадзіўся Бэла Бартак, венгерскі кампазітар, піяніст, музычны фалькларыст.

**1901** год — 25—30 сакавіка на спаборніцтвах у Ніцы адбыўся трыумфальны дэбют аўтамабіля «мерседэс», створанага канструктарам Вільгельмам Майбахам.

**1911** год — нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Пугачоў, расійскі вучоны ў галіне аўтаматызацыі і працэсаў кіравання, заснавальнік статыстычнай тэорыі кіраваных сістэм, стваральнік навуковай школы ў галіне авіяцыйнай балістыкі, акадэмік РАН, генерал-маёр. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948, 1976), Ленінскай прэміі (1990).



**1921** год — нарадзілася Сімона Сіньёрэ (Камінкер), французская кінаактрыса.

**1956** год — нарадзіўся Яфім (Нахім) Залманавіч Шыфрын, расійскі акцёр, артыст эстрады, сатырык.

**1961** год — на канферэнцыі прадстаўнікоў краін — членаў ААН была прынятая «Адзіная канвенцыя аб наркатычных сродках».

**1996** год — у сталіцы Фіджы горадзе Суве прадстаўнікі трох ядзерных дзяржаў свету — ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі — падпісалі дакумент аб далучэнні да Дагавора аб абвяшчэнні паўднёвай часткі Ціхага акіяна бяз'ядзернай зонай (Дагавор Раратонга).

Так гаварыў...

**СЕНЕКА:**

*«І пасля дрэннага ўраджаю трэба сеяць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Гісторыя аднаго забойства.**

**Цэлы дзень ляпіла пельмені, муж прыйшоў дадому, паеў, а потым сказаў:**

**— Больш такія не купляй.**

— Ведаеце, няцяжка ададаць жонцы ўсю зарплату. Цяжка даказаць, што гэта ўся.

**— Вы не заўважалі, што людзі, якія маюць агульны з вамі пункт гледжання, неяк больш разумныя за іншых?..**

— Яшчэ два блінцы — і разыходзімся! — шапталі Галінцы швы на спадніцы.

**Звычайна ўсе хочуць пахудзець да лета, але мала хто хоча паразумнець да восені ці падабрэць да зімы.**

Галоўная праблема сучаснай моладзі — што ты ёю больш не з'яўляешся.

**Мікітка атрымаў на дзень нараджэння зусім не тое, што хацеў, таму з табурэткі сказаў зусім не тое, што вучыў.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспл. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 661. Нумар падпісаны ў 19.30 24 сакавіка 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12